СЯМ'Я «ПЕСНЯРОЎ» ПРА ЎЛАСНАЕ ШЧАСЦЕ

Сямейная

ЯК НЕ «ЗГАРЭЦЬ» ПАДЧАС ДЭКРЭТНАГА ВОДПУСКУ

Сямейная

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

28 ЛІСТАПАДА 2019 г. ЧАЦВЕР № 226 (29093)

ЦЫТАТА ДНЯ

Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:

«У плане сямейнага жыцця на хатнюю працу, выхаванне дзяцей, догляд пажылых жанчыны трацяць у два разы больш часу, чым мужчыны. Цяпер важна знайсці ўмовы, механізмы, магчымасці для таго, каб жанчына не ў шкоду сям'і або работы рабіла тое, на што яна нацэлена сама. Беларусь паслядоўна рухаецца ў гэтым кірунку. Прыкладам могуць служыць нормы, прадугледжаныя ў Працоўным кодэксе, які ўваходзіць у сілу ў канцы студзеня 2020 года. Гаворка перш за ўсё пра водпуск на 14 дзён для бацькі па доглядзе дзіцяці на працягу шасці месяцаў пасля нараджэння. Важна, каб, як толькі дзіця з'явілася на свет, маці і бацька разам займаліся яго выхаваннем. Не варта блытаць гэтую норму з водпускам па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. Тут таксама дадзена права бацьку, калі мама хоча працаваць, забяспечваць догляд».

СТАГАДОВАЯ ДЗЕВЯТНАЦЦАТАЯ

Фота БелТА.

Гэтымі днямі адна з найстарэйшых сярэдніх школ сталіцы — № 19 — святкуе векавы юбілей. З 1919 года ўстанова адукацыі некалькі разоў мяняла месца размяшчэння (сёння яе будынак знаходзіцца на Залатой Горцы), але амаль з самага заснавання і да нашага часу з гонарам утрымлівае статус школы выдатных матэматыкаў. Да таго ж з 1945 года яна носіць імя Янкі Купалы. Так што нагоды для гонару ў сённяшніх навучэнцаў дзевятнаццатай ёсць. Як, напэўна, і жаданне быць не горшымі за тых, хто атрымліваў тут веды цягам стагоддзя.

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:

«Людзі хочуць нармальна жыць і працаваць і не жадаюць узрушэнняў»

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу — пра зробленае адыходзячым парламентам і некаторыя вынікі парламенцкіх выбараў

Фота БелТА.

— Уладзімір Паўлавіч, парламент шостага склікання завяршае сваю дзейнасць і праз некалькі дзён стане гісторыяй беларускага парламентарызму. Які ён быў, калі азірнуцца на пройдзены шлях?

— Сваю канстытуцыйную ролю Палата прадстаўнікоў выканала, актыўна працуючы на карысць нашай краіны. Гэта самае галоўнае.

Прынята больш за 130 законапраектаў у першым чытанні і больш за 270 — у другім, з іх 254 падпісаны Прэзідэнтам. Мы штогод своечасова, аператыўна прымалі збалансаваны рэспубліканскі бюджэт, адметнасцю якога з'яўляецца сацыяльная накіраванасць. У бюджэце на 2020 год яна ўмацуецца.

СТАР. 2

Імя салдата

ДЗЁННІК ГРОЗНАГА

Бабруйская сям'я Яўзрэзавых беражліва захоўвае ваенныя запісы свайго гераічнага продка

Валявы падбародак, цвёрды позірк, шчыльна сціснутыя вусны — нават на фота ён выглядае рашучым і бескампрамісным. Нездарма яго баявая мянушка была менавіта Грозны. Гэта ён у 1942-м наводзіў жах на немцаў у Жлобінскім раёне. Імя героя — Іоў Крышнёў, камандзір партызанскага атрада «Смерць фашызму». У сваім баявым дзённіку ён апісаў падзеі за перыяд са жніўня 1942-га да сакавіка 1943 года. Такіх рарытэтных рэчаў не вельмі шмат, і бабруйская сям'я Яўзрэзавых вельмі ганарыцца, што мае такую рэліквію.

СТАР. 13

Той самы баявы дзённік.

КАРАТКА

- Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў учора з рабочым візітам у Кыргызстан, каб узяць удзел у саміце Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.
- **Відэаролік беларускай школьніцы Настассі Пякарчык перамог у творчым конкурсе «Я берагу энергію» ў Расіі.**
- У Полацку ўзнагародзілі падлеткаў, якія дапамаглі выкрыць педафіла.
- **У Нью-Ёрку забароняць электронныя цыгарэты.**
- Зборная Беларусі па пляжным футболе завяршыла выступленне на чэмпіянаце свету ў Парагваі, саступіўшы камандзе Расіі з лікам 3:5.

ISSN 1990 - 763X

«Людзі хочуць нармальна жыць і працаваць і не жадаюць узрушэнняў»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прадугледжана павелічэнне зарплаты нізкааплатным катэгорыям грамадзян, педагогам і медыцынскім работнікам, падняцце ўзроўню пенсій да 40 працэнтаў ад сярэдняй зарплаты. Зарплата бюджэтнікаў у адносінах да сярэдняй у эканоміцы складзе не менш за 80 працэнтаў. У сувязі з 75-годдзем Перамогі будзе аказана аднаразовая матэрыяльная дапамога ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і пацярпелым ад наступстваў вайны. Працягнецца фінансаванне сямейнага капіталу. Сродкі з яго з наступнага года можна будзе выкарыстоўваць на паляпшэнне жыллёвых умоў, атрыманне адукацыі і на медыцынскія паслугі пашыранага пераліку.

Прыняты шэраг заканадаўчых актаў шырокага грамадскага гучання. Адзначу вельмі важную карэкціроўку Працоўнага кодэкса, новую рэдакцыю Жыллёвага кодэкса, змяненні ў Закон аб ахове працы. Умацаваныя працоўныя гарантыі, удасканалены прававыя нормы забеспячэння бяспекі жыцця і здароўя тых, хто працуе на вытворчасці, пашырыліся магчымасці для самазанятасці і дыстанцыйнай работы, правы грамадзян на паслугі ў жыллёвай сферы, на якасныя і бяспечныя харчовыя прадукты. Стануць больш даступнымі лякарствы, у тым ліку для грамадзян з сур'ёзнымі захворваннямі.

Нямала зроблена па стымуляванні эканамічных пераўтварэнняў, дзяржаўна-прыватнага партнёрства, лібералізацыі бізнес-асяроддзя, развіцці прадпрымальніцтва і IT-тэхналогій. Істотным плюсам заканатворчай дзейнасці дэпутатаў шостага склікання я назваў бы і прыняцце закона аб арганічнай прадукцыі.

Пералік прававых новаўвядзенняў сацыяльнага, эканамічнага і іншага характару даволі аб'ёмны. Усе яны ідуць ад жыцця і даюць адказы на пастаўленыя жыццём пытанні ў розных сферах. Мы фіксуем у заканадаўстве тое, што адпавядае сацыяльна-эканамічным і іншым задачам краіны і грамадскім запытам.

— Цікава, свае законапраекты парламентарыі прапаноўвалі?

— Сваё права заканадаўчай ініцыятывы дэпутаты выкарыстоўвалі актыўней, чым у папярэдніх скліканнях. Унеслі шэсць законапраектаў, тры з якіх прынятыя і ўжо сталі законамі.

Прынцыповы акцэнт: мы лічым вельмі важным пры распрацоўцы нормаў права абапірацца на грамадскую думку. Многія парламентарыі маюць свае блогі ў сацыяльных сетках. Па шэрагу законапраектаў праведзена грамадскае абмеркаванне на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале. Найбольш слушныя прапановы ўлічаны пры дапрацоўцы законапраектаў.

Яшчэ хацеў бы сказаць, што ўмацаваўся патэнцыял нашага ўдзелу ў парламенцкай дыпламатыі. Устаноўлены міжнародныя сувязі шырокага геаграфічнага дыяпазону на еўрапейскім, азіяцкім, амерыканскім і афрыканскім кантынентах. Дэлегацыя Нацыянальнага сходу Беларусі пазнавальная і аўтарытэтная на міжнароднай арэне. Да нас прыслухоўваюцца на міжнародных парламенцкіх форумах і, што вельмі важна, падтрымліваюць рэзалюцыі, якія мы прапануем. Гэта сведчанне новага стаўлення міжнароднай супольнасці да Рэспублікі Беларусь і міратворчых ініцыятыў кіраўніка нашай дзяржавы.

— Ці засталіся ў Палаты прадстаўнікоў заканатворчыя рэзервы?

— Яны заўсёды застаюцца там, дзе бруіць творчая думка, сутыкаюцца розныя погляды і прапануюцца ідэі. Заканатворчасць — гэта вельмі складаная, жывая справа з удзелам многіх устаноў, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, у якой парламентарыям адведзена ключавая роля. Выязныя пасяджэнні пастаянных камісій, парламенцкія слуханні, круглыя сталы, семінары, канферэнцыі па заканатворчых пытаннях мы праводзім дзеля таго, каб заканадаўства было сугучнае з задачамі развіцця краіны і патрэбамі грамадства. У выніку такой пастаяннай работы ў прававую базу ўносяцца даволі істотныя і змястоўныя дапаўненні.

— Уладзімір Паўлавіч, вы маеце заканатворчыя мары?

— Я рэаліст. Мары ж у многім адарваны ад рэальнасці, таму ні ў якім разе не павінны ўвасабляцца ў законах, а значыць — у агульных правілах і стандартах. Калі гэтыя правілы і стандарты своечасова настройваць у адпаведнасці са зменамі, што адбываюцца ў краіне, то і эфектыўнасць сваёй дзейнасці парламент павышае. У такім кірунку мы і рухаемся. На сваім гаспадарчым і парламенцкім вопыце я пераканаўся, што прававыя навацыі абавязкова павінны быць рэалістычнымі і карыснымі для сферы, якая рэгулюецца, для людзей.

— На рабочай сустрэчы з вамі Прэзідэнт адзначыў, што дэпутаты цяперашняга склікання папрацавалі добра. У новым парламенце павінна быць забяспечана пераемнасць у дзейнасці. Што, на вашу думку, неабходна захаваць і развіваць?

— Называю па пунктах. Першае — адладжаны, дзейсны механізм заканатворчай работы ад нулявога чытання законапраектаў да іх прыняцця. Другое — дзелавы тонус нашых парламенцкіх абмеркаванняў і дыскусій. Трэцяе — канструктыўнае ўзаемадзеянне з экспертнай супольнасцю, суб'ектамі права заканадаўчай ініцыятывы, дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі, зацікаўленымі ў прыняцці таго ці іншага заканадаўчага акта.Чацвёртае — ініцыятыўная пазіцыя ў міжнародным і міжпарламенцкім супрацоўніцтве. Пятае — разнастайнасць формаў работы з выбаршчыкамі, грамадскасцю і сродкамі масавай інфармацыі.

«У мяне склалася ўражанне, што кандыдаты ад апазіцыі імкнуцца трапіць у парламент, каб прадстаўляць там саміх сябе, забываючы, што дэпутат з'яўляецца прадстаўніком усіх выбаршчыкаў і ўпаўнаважаны абараняць іх інтарэсы і інтарэсы краіны як прадстаўнік органа дзяржаўнай улады. Нельга спрошчана падыходзіць да сур'ёзных рэчаў».

— У Палаты прадстаўнікоў унікальны рэсурс публічнасці. Напэўна, ён дапамог цяперашнім 30 дэпутатам, якія балаціраваліся на парламенцкіх выбарах, атрымаць электаральную перавагу перад сваімі канкурэнтамі. Як вы мяркуеце?

— Усё залежала ад самога прэтэндэнта на дэпутацкі мандат. Калі ён мае грамадскі аўтарытэт, належную прафесійную і агульную падрыхтоўку, каб займацца заканатворчай работай, прадуманую праграму, вядомы сваімі канкрэтнымі справамі ў рэгіёне, то, думаю, гэта і дазваляе яму атрымаць давер выбаршчыкаў. Дэпутацкі вопыт — не падстава для электаральнай паблажкі, а большая адказнасць.

— Канкурэнцыя на парламенцкіх выбарах была даволі высокая — у сярэднім пяць чалавек на месца. Значыць, аўтарытэт Палаты прадстаўнікоў расце. Сярод 110 абраных дэпутатаў 21 прадстаўнік палітычных партый, але апаненты ўлады даверу большасці выбаршчыкаў не атрымалі. На вашу думку, чаму?

— Выбарчы кодэкс гарантуе партыям удзел у выбарчым працэсе, нават калі ў акрузе ў іх няма пярвічных партыйных структур. Партыі, прадстаўнікі якіх былі зарэгістраваныя кандыдатамі ў дэпутаты, мелі магчымасць праявіць сябе на палітычным полі, весці дыялог з выбаршчыкамі, займець электаральныя сімпатыі. Аднак заканадаўча пашыраныя магчымасці партый і рухаў у самім выбарчым працэсе выкарысталі не ўсе. Прычыны нездавальняючага для іх выніку выбараў апанентам улады трэба шукаць у гэтым і ў сваёй грамадзянскай пазіцыі. У мяне склалася ўражанне, што кандыдаты ад апазіцыі імкнуцца трапіць у парламент, каб прадстаўляць там саміх сябе, забываючы, што дэпутат з'яўляецца прадстаўніком усіх выбаршчыкаў і ўпаўнаважаны абараняць іх інтарэсы і інтарэсы краіны як прадстаўнік органа дзяржаўнай улады. Нельга спрошчана падыходзіць да сур'ёзных рэчаў.

— Але ж палітычнае структураванне ў грамадстве пакуль ідзе вяла. Уяўленне пра шэраг партый у выбаршчыкаў хіба што па іх назве.

— Выбарчая пляцоўка дазваляе партыям стаць бліжэйшымі да людзей, зразумець настроі ў розных сацыяльных сегментах, а значыць — што трэба карэктаваць у сваёй пазіцыі і ў сваіх дзеяннях. Думаю, гэта вельмі важна для аўтарытэту партыі.

— Напэўна, партыі апладзіравалі б пераходу да парламенцкіх выбараў па партыйных спісах, калі б ён адбыўся.

— Пры сённяшняй замкнутасці партыйных структур на саміх сабе, а то і віртуальнасці такое рашэнне было б несвоечасовым, больш за тое, некарысным для грамадска-палітычнай стабільнасці, бо ніводная партыя яшчэ не здабыла шырокай падтрымкі ў грамадстве.

Удзел у парламенцкім выбарчым працэсе па існуючай мажарытарнай сістэме якраз дазваляе выпраўляць такое становішча, набліжацца да рэальнага жыцця і праз агітацыю за сваіх кандыдатаў у дэпутаты аказваць уплыў на самавызначэнне выбаршчыкаў. Ігнараваць гэта наўрад ці правільна, калі думаць пра будучыню партыі.

Я ўжо выказваўся пра магчымую мэтазгоднасць пераходу на мажарытарна-прапарцыянальную выбарчую сістэму праз пэўны час, калі адбудуцца рэальныя, прыкметныя для грамадскасці зрухі ў развіцці партыйнага будаўніцтва. Сёння ж падстаў для гэтага яшчэ няма.

— На вашу думку, што можа павысіць аўтарытэт партый у сучасных умовах?

— Грамадска адказная пазіцыя ва ўсіх дзеяннях. Палітыканству і легкадумным абяцанням людзі сёння не вераць. Падчас рабочых паездак у рэгіёны і ў сваю выбарчую акругу я наведваю прадпрыемствы, установы і арганізацыі, шчыра гутару з людзьмі і ведаю іх настроі, як кажуць, з першых рук.

— Што гэта дае асабіста вам?

— Рэальнае, дакладнае веданне спраў у рэгіёнах, таго, што клапоціць і хвалюе простага чалавека. Заўсёды знаходзішся на вастрыі праблем, у вырашэнні якіх патрэбны намаганні мясцовых органаў улады, дапамога дэпутата або карэкціроўка заканадаўства. Ніводную просьбу да мяне не пакідаю па-за ўвагай, трымаю на кантролі да прыняцця па ёй рашэння. Аператыўна здымаюцца многія пытанні.

— Па вашых назіраннях, Уладзімір Паўлавіч, які галоўны запыт да абноўленага парламента дамінуе ў грамадскай думцы?

— На заканадаўчым узроўні рабіць усё магчымае для захавання міру і спакою ў грамадстве. Людзі хочуць нармальна жыць і працаваць і не жадаюць узрушэнняў, якія маглі б пашкодзіць грамадска-палітычнай стабільнасці. Таму і абралі ў парламент тых, хто здольны працаваць на вырашэнне канкрэтных пытанняў, звязаных з развіццём эканомікі і сацыяльнай сферы, працаваць на дабрабыт Беларусі.

Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.

Парламенцкі дзённік

БЕЗ КАМПЕНСАЦЫІ, АЛЕ З НАДЗЕЯЙ

Рэспубліканскі бюджэт на 2020 год прыняты ў другім чытанні

На пасяджэнні сёмай сесіі Палаты прадстаўнікоў дэпутаты зацвердзілі сумы даходаў, расходаў бюджэту і сам законапраект. Гэта ўжо трэцяе чытанне галоўнага фінансавага дакумента краіны на 2020 год у бягучым месяцы. На мінулым тыдні дэпутаты прынялі яго ў першым чытанні.

Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Людмілы ДАБРЫНІНАЙ,** бюджэт будучага года — вынік кампрамісу эканамічных, палітычных і сацыяльных інтарэсаў.

Міністр фінансаў Максім ЕРМАЛОВІЧ адзначыў: «Бюджэт 2020 года не толькі не пагаршае сітуацыю з фінансаваннем бюджэтнага сектара, але і дастаткова сур'ёзны крок наперад мы робім па павышэнні заробкаў у ім. Пры гэтым напаўненне іншых расходаў сацыяльнага характару, расходаў, якія забяспечваюць дзейнасць бюджэтных арганізацый, таксама істотна ўзрастае. Гэта дазваляе нам меркаваць, што якасць бюджэтных паслуг працягне павышацца ў наступным годзе, асабліва ў сферы адукацыі і аховы здароўя. Акрамя таго, мы значна павысім узровень жыцця работнікаў бюджэтнага сектара».

Пры гэтым падтрымка рэальнага сектара эканомікі скарачаецца на 10 %. Плануецца, што частка прадпрыемстваў выйдзе на самастойную паспяховую работу. Па іншых будуць прымацца рашэнні па рэструктурызацыі іх абавязкаў, змене формы кіравання і пераарыентацыі.

«2020 год — год, у якім мы сюрпрызаў не чакаем, нягледзячы ні на якія знешнія абставіны і магчымыя змяненні макраэканамічнай кан'юнктуры як у рэгіёне, так і на глабальных рынках», — лічыць міністр фінансаў.

У бюджэт закладзены той кошт газу, што і сёлета (у 2019 годзе цана на расійскі газ для Беларусі складае $127 за 1 тысячу кубаметраў. — **«Зв.»**). Працягваюцца перамовы аб кампенсацыі падатковага манеўру. Як адзначыў Максім Ермаловіч, яны не заканчваліся ніколі, і пакуль рана казаць аб іх выніках. Дэпутаты разглядаюць аптымістычны варыянт выйсця з сітуацыі. «У бюджэце не прадугледжаны даходы ад кампенсацыі падатковага манеўра Расійскай Федэрацыі. Калі ўдасца дамовіцца, гэта пойдзе плюсам», — сказала **журналістам парламентарый Вольга ПАЛІЦІКА.**

Беларусь пакуль разыходзіцца з Міжнародным валютным фондам у плане бачання хуткасці рэформаў, таму перспектыў для новых праектаў пакуль няма. Падтрымка, як растлумачыў міністр фінансаў, можа давацца з дзвюма мэтамі: для стабілізацыі макраэканамічнай сітуацыі і рэалізацыі структурных рэформаў. Наконт першага сцэнарыя Максім Ермаловіч спадзяецца, што такі крэдыт не будзе патрэбны ні сёлета, ні налета. У дачыненні да структурных рэформаў змяненні ўжо ёсць — і ў сістэме кіравання дзяржаўнымі прадпрыемствамі, і ў сельскагаспадарчай вытворчасці, і ў іншых сферах дзяржсектара эканомікі. «Можна сказаць адназначна: яны хацелі б бачыць больш хуткія рэформы ў дзяржаўным сектары. Хацелі б бачыць больш актыўнае павышэнне тарыфаў на паслугі ЖКГ для кампенсацыі затрат на аказанне гэтых паслуг і скарачэнне бюджэтнай падтрымкі насельніцтва. Я думаю, што тут мы пакуль разыходзімся па хуткасці гэтых дзеянняў і перспектыў. Што мы прыйдзем да згоды па дзвюх гэтых пазіцыях налета, я пакуль не бачу», — сказаў міністр.

Для першага чытання **міністр унутраных спраў Юрый КАРАЕЎ** прадставіў змяненні ў закон «Аб адзінай дзяржаўнай сістэме рэгістрацыі і ўліку правапарушэнняў». Дакумент павінен урэгуляваць улік і рэгістрацыю ў адзіным банку даных звестак аб правапарушэннях, а таксама пытанні давання такіх звестак дзяржорганам і іншым беларускім, замежным і міжнародным арганізацыям і фізічным асобам. Папяровы дакументаабарот будзе скарачацца ў бок электроннага і сінхранізавацца. «Усё будзе законна з боку давання (інфармацыі. — **«Зв.»**)», — заявіў кіраўнік МУС.

Па словах Юрыя Караева, МУС адрэгулюе пытанні доступу да базы і банкаў даных, каб пазбегнуць выпадкаў неабгрунтаванай адмовы ў паслугах.

Марыя ДАДАЛКА.

ВЯРШЫНЯ І НОВАЯ ПРЫСТУПКА

Прэм'ер-міністр уручыў дзяржаўныя ўзнагароды найлепшым прадстаўнікам працоўных калектываў краіны

Больш за сто беларусаў атрымалі медалі «За працоўныя заслугі», медалі Францыска Скарыны, медалі «За выратаванае жыццё», «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку» і падзякі Прэзідэнта. Па даручэнні кіраўніка краіны цырымонію ўшаноўвання ў Палацы Рэспублікі ўзначаліў **прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС.**

Ён звярнуўся са словамі ўдзячнасці да прадстаўнікоў кожнай са сфер, адзначыў, што дзякуючы намаганням будаўнікоў, прадстаўнікоў транспартнай і дарожнай галін, камунальнай гаспадаркі жыццё ў Беларусі становіцца больш прыгожае, зручнае, сучаснае. Сёлета зроблены значны крок па паляпшэнні якасці аўтатрас, рэканструкцыі мастоў і транспартных развязак. Кіраўнік урада ўпэўнены, што і надалей дарожнікі з поспехам будуць выконваць пастаўленыя перад імі задачы.

Работнікі мытні і падатковай службы — людзі, якія штодзённа стаяць на варце эканамічнай бяспекі краіны, ад чыёй працы шмат у чым залежыць устойлівае фарміраванне бюджэту, а значыць, і рэалізацыя важных сацыяльна-эканамічных праграм. Сяргей Румас падкрэсліў, што своечасовае паступленне падаткаў — неабходная ўмова развіцця інфраструктуры і павышэння дабрабыту насельніцтва.

Высокія ўзнагароды атрымалі працаўнікі нафтахімічнага комплексу. Беларускія арганізацыі хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці штогод пацвярджаюць свой статус навукаёмістых прадпрыемстваў са стабільным развіццём, робяць значны ўнёсак у забеспячэнне дзяржаўных параметраў эканамічнага росту. Прэм'ер-міністр звярнуў увагу на сусветнае прызнанне, якое атрымала высакаякасная, сучасная прадукцыя беларускіх хімічнай і нафтахімічнай галін. Расце колькасць яе спажыўцоў у краінах далёкага і блізкага замежжа.

Адзначыў кіраўнік Саўміна і працу работнікаў авіякампаніі «Белавія», што сёлета парадавала пасажыраў не толькі новымі напрамкамі авіясувязі, але і ўвядзеннем гібкіх тарыфаў, пашырэннем пераліку паслуг; працаўнікоў «Белтэлекама», які дазваляе Беларусі займаць высокія месцы ў міжнародных рэйтынгах. «32-е месца ў свеце па індэксе развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і 24-е месца ў свеце сярод 196 краін па колькасці абанентаў шырокапалоснага доступу ў сетку «Інтэрнэт», — прывёў лічбы Сяргей Румас.

Узнагароджаны на ўзроўні дзяржавы і прадстаўнікі айчыннай навукі, без якой немагчыма фарміраванне міжнароднага іміджу краіны з высокім узроўнем інтэлектуальнага і чалавечага капіталу, а таксама дзяржаўныя служачыя, работнікі выканкамаў, розных міністэрстваў і ведамстваў.

Знайшлі ўзнагароды і работнікаў сферы адукацыі. Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што беларускія педагогі паспяхова ствараюць новыя вучэбныя праграмы, асвойваюць самыя сучасныя методыкі навучання, рэалізуюць перспектыўныя навуковыя праекты. Іх праца дазваляе ганарыцца дасягненнямі на міжнародных прадметных алімпіядах, дзе нашы школьнікі нязменна пацвярджаюць высокі ўзровень ведаў.

«Толькі сёлета з 65 беларускіх удзельнікаў міжнародных прадметных алімпіяд 46 вучняў сталі пераможцамі, заваяваўшы шэсць залатых, 15 сярэбраных і 25 бронзавых медалёў», — працягнуў Сяргей Румас.

Ён асобна адзначыў навучэнца Навагрудскага аграрнага каледжа — хлопец выратаваў жанчыну, якая танула. Рызыкаваць уласным жыццём, не даць загінуць чалавеку гатовы толькі моцныя духам людзі — і Барыс Півень аказаўся з такіх.

Высока ацаніў кіраўнік Саўміна работу прадстаўнікоў сферы культуры, якая насамрэч шырэйшая за святочныя канцэрты, тэатральныя пастаноўкі, кінафільмы. Гэта штодзённая, часам непрыкметная праца тысяч людзей, якія прысвяцілі жыццё служэнню культуры. Сяргей Румас упэўнены, што педагогі школ мастацтваў, музычных і мастацкіх школ, супрацоўнікі музеяў, бібліятэк, клубаў, дамоў культуры выконваюць адказную і высакародную місію: захоўваюць і прымнажаюць культурную спадчыну Беларусі, развіваюць духоўны патэнцыял народа.

На цырымоніі ўручаны дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўнікам творчых саюзаў, грамадскіх аб'яднанняў, сродкаў масавай інфармацыі. Падзякі Прэзідэнта атрымалі і трэнеры, выхаванцы якіх сёлета ва ўмовах высокай канкурэнцыі ў абсалютнай большасці відаў праграмы II Еўрапейскіх гульняў занялі другое агульнакаманднае месца.

«Працаваць і рабіць дабро для сваёй краіны — вялікі сэнс і яўная каштоўнасць для грамадзян і патрыётаў нашай радзімы», — у адказ выказаў перакананасць **рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Міхаіл БАРАЗНА.**

Ён падкрэсліў, што атрыманне дзяржаўнай узнагароды — новая прыступка ў жыцці любога.

Варвара МАРОЗАВА.

На кантролі

НА РАБОТУ ЯК НА СУБОТНІК

Чаму наймальнікі затрымліваюць заработную плату

Пытанні своечасовай выплаты заработнай платы знаходзяцца на пастаянным кантролі органаў пракуратуры Мінскай вобласці. У цэлым у цэнтральным рэгіёне сітуацыя па гэтым пытанні стабільная. Аднак па стане на 1 лістапада запазычанасць па зарплаце ў памеры 2,42 мільёна рублёў зафіксавана ў трох арганізацыях Міншчыны. Пра гэта паведаміў начальнік аддзела абласной пракуратуры Леанід Нячай.

Пракуратура сумесна з кантралюючымі органамі ў асобных выпадках ініцыявала прыцягненне да адказнасці наймальнікаў, якія не вытрымлівалі тэрмінаў і парадку выплаты заробкаў. У прыватнасці, пракурор Мінскага раёна вынес прадпісанне кіраўніку аднаго з закрытых акцыянерных таварыстваў з патрабаваннем прыняць меры па выплаце зарплаты работнікам. Але яно не было выканана. У выніку генеральны дырэктар прадпрыемства прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці, а ўпаўнаважаная асоба наймальніка — намеснік дырэктара атрымаў адміністрацыйнае спагнанне за парушэнне тэрмінаў выплаты зарплаты. Пасля ўмяшання пракуратуры заробкі выплачаны часткова. Кіраўніцтва таварыства звярнулася ў банкі па пытанні выдзялення крэдытаў для пагашэння запазычанасці. У пракуратуру горада Жодзіна паскардзіліся супрацоўнікі ўнітарнага прадпрыемства, што ім затрымліваюць заработную плату. Па выніках праверкі наймальнік панёс адказнасць.

Фота Таццяны ГКАЧОВАЙ.

Усяго ж сёлета па выяўленых фактах парушэння заканадаўства аб своечасовай выплаце зарплаты і абароне працоўных правоў грамадзян органы пракуратуры Мінскай вобласці вынеслі 27 актаў пракурорскага нагляду. Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты дзевяць асоб. Арганізацыі пагасілі перад работнікамі запазычанасць па зарплаце на суму звыш 1,9 мільёна рублёў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Будзьце пільныя!

Пазбавіцца грошай за лічаныя секунды

Кожнае дзясятае злачынства звязана са сферай высокіх тэхналогій

Гэтай восенню Беларусь захліснула хваля масавага махлярства з банкаўскімі карткамі. Сутнасць злачыннага працэсу простая. Адбываецца званок на мабільны тэлефон. Суразмоўца прадстаўляецца супрацоўнікам банка. Ён кажа, што, маўляў, з грашыма на рахунках адбываюцца махлярскія дзеянні. Крок за крокам, выкарыстоўваючы метады ўваходжання ў давер, ён выцягвае асабістыя звесткі і рэквізіты, якія датычацца аперацый з карткай. Пры гэтым у трубцы ствараецца імітацыя рабочай абстаноўкі кол-цэнтра банка... Але як толькі вы расказалі ўсе звесткі і коды (якія нельга паведамляць нават супрацоўнікам банка, што агаворваецца падчас выдачы карткі), грошы тут жа знікнуць з рахунку. Гаворка часам можа ісці пра тысячы рублёў...

— Імклівае ўкараненне камп'ютарных тэхналогій не засталося без увагі як асобных злачынцаў, так і арганізаваных крымінальных груповак, — зазначыў **начальнік упраўлення па расследаванні злачынстваў супраць інфармацыйнай бяспекі і інтэлектуальнай уласнасці цэнтральнага апарата Следчага камітэта Сяргей ГАМКО.** — У тым ліку і тых, якія носяць транснацыянальны характар, — у віртуальнай прасторы межы сціраюцца.

Адпаведна, хутка расце і колькасць кіберзлачынстваў. Калі летась за 10 месяцаў іх было зарэгістравана 3518, то сёлета за такі ж перыяд — ужо 7694.

— Кожнае дзясятае злачынства датычыцца сферы кіберпрасторы. Мы правялі спецыяльнае апытанне на тэму бяспекі ў камп'ютарнай галіне, — расказаў **начальнік упраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій крымінальнай міліцыі МУС Вадзім УСЦІНОВІЧ.** — Кожны дзявяты чалавек карыстаецца інтэрнэт-банкінгам, але толькі кожны пяты з іх адчувае сябе ў бяспецы. Фінансавая абароненасць мае патрэбу ва ўдасканаленні. Здзіўляюць даверлівае стаўленне людзей і спадзяванні, што менавіта іх непрыемнасці абмінуць. Але ў інфармацыйную бяспеку трэба ўкладваць грошы. Асабліва калі гаворка ідзе пра юрыдычныя асобы. Пра якую бяспеку можна казаць, калі бухгалтар сыходзіць дадому і пакідае ключ з электронна-лічбавым подпісам у камп'ютары?

Сёлета за правапарушэнні ў сферы высокіх тэхналогій ужо адказалі перад законам 1185 чалавек, сярод якіх 432 да таго ўжо мелі судзімасць у сваёй біяграфіі. Расце і лічба ўрону — агульная яго сума павялічылася сёлета больш чым у пяць разоў, амаль да шасці мільёнаў рублёў! А ўдалося кампенсаваць толькі 2/3 гэтай сумы. Варта зазначыць, што летась гэты паказчык не перавышаў 20 %.

«Рэкорд» сумы скрадзеных сёлета грошай — амаль 515 тысяч беларускіх рублёў. Вадзім Усцінавіч адзначыў, што ўсё адбылося ад таго, што арганізацыя не выконвала захады інфармацыйнай бяспекі, — у камп'ютары пакінулі флэшку з ключом да электроннага подпісу.

Начальнік упраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій ГУУС Мінгарвыканкама Андрэй КАВАЛЁЎ расказаў пра гэты выпадак падрабязней:

— Галоўны бухгалтар паведаміла пра гэта штатнаму айцішніку. Пад вечар ён сказаў дырэктару, што зрабіць ужо нічога не можа. Толькі а 18-й гадзіне пра гэта стала вядома міліцыі, мы пачалі прадпрымаць пэўныя захады. Паўночы мы ўзаемадзейнічалі з усімі банкамі і аплатнымі сістэмамі, каб заблакаваць грошы. Частку ўдалося вярнуць.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Жыхары Еўропы трацяць на наркотыкі 30 мільярдаў еўра ў год

Кантрабанда застаецца адной з асноўных крыніц даходу для арганізаваных злачынных груповак. Пра гэта сведчаць звесткі з даклада, падрыхтаванага Еўрапейскім цэнтрам маніторынгу наркотыкаў і нарказалежнасці (EMCDDA) на аснове аналізу інфармацыі за 2017 год. Самую вялікую долю на гэтым рынку займае марыхуана — па самых сціплых падліках 11,6 мільярда еўра. Доля какаіну — дзевяць мільярдаў, гераіну — сем мільярдаў. Дырэктар цэнтра EMCDDA Алексіс Гусдзіл тлумачыць: «Сёння мы назіраем празмерна высокі ўзровень вытворчасці наркотыкаў як унутры, так і за межамі ЕС, што прыводзіць да высокай даступнасці натуральных і сінтэтычных рэчываў». За перыяд з 2013 года кантрабанда марыхуаны вырасла на 38 працэнтаў. Для адмывання грошай злачынцы ўсё часцей звяртаюцца да высокатэхналагічных метадаў, у тым ліку да выкарыстання крыптавалют. Па звестках экспертаў, сродкі ад кантрабанды наркотыкаў — асноўная крыніца фінансавання такіх узброеных груповак, як «Бока харам», «Ісламская дзяржава» і «Аш-Шабаб».

Турпаток у Егіпет наблізіўся да 10-гадовага максімуму

Колькасць турыстаў, якія едуць у Егіпет, вяртаецца да рэкорднага паказчыка, дасягнутага ў 2010-м, расказала Bloomberg TV міністр турызму краіны Ранія аль-Машат. Яна заявіла, што ў 2018/2019 фінансавым годзе на турызме Егіпет атрымаў больш за 12,5 мільярда долараў — «найбуйнейшы прыбытак ад турызму» ў гісторыі краіны. Міністр перакананая, што рост колькасці турыстаў — гэта пацвярджэнне эфектыўнасці новага падыходу ўлад, які прадугледжвае больш жорсткія стандарты размяшчэння гасцей і пашырэнне намаганняў па прасоўванні Егіпта як турыстычнага напрамку па ўсім свеце. Яна падкрэсліла, што краіна імкнецца даць гасцям новыя магчымасці, акрамя «культурнай спадчыны або сонца і мора». На турызм прыпадае 15 працэнтаў егіпецкага ВУП, сцвярджае Bloomberg. Агенцтва падкрэслівае, што па гэтым напрамку ўдарыла рэвалюцыя 2011 года, падчас якой быў зрынуты прэзідэнт краіны Хосні Мубарак. Акрамя таго, у 2015 годзе адбылася трагедыя з самалётам авіякампаніі «Кагалымавія», што ляцеў з Шарм-эль-Шэйха ў Санкт-Пецярбург.

Сацыёлагі вызначылі галоўныя страхі расіян

Як вынікае з апытання Усерасійскага цэнтра вывучэння грамадскай думкі, больш за ўсё расіяне асцерагаюцца росту сацыяльнай несправядлівасці, рызыкі зніжэння даходаў, а таксама магчымасці страціць бясплатную медыцынскую дапамогу. Вынікі апытання аказаліся ў распараджэнні РБК. У прыватнасці, 68 працэнтаў рэспандэнтаў больш за ўсё баяцца росту сацыяльнай несправядлівасці, крыху менш за 63 працэнты расіян асцерагаюцца страціць узровень наяўнага прыбытку. Апынуцца без бюджэтнай медыцынскай дапамогі баяцца 58 працэнтаў. Такая ж колькасць апытаных апасаецца магчымага росту цэн на тавары. 39 працэнтаў непакояць унутраныя беспарадкі ў краіне. 20 працэнтаў расіян, якія бралі ўдзел у апытанні, асцерагаюцца абвастрэння міжнародных канфліктаў, 35 працэнтаў баяцца страціць работу і 36 працэнтаў больш за ўсё турбуе рост злачыннасці.

Будзе свята!

У ЧАКАННІ НАВАГОДНЯЙ КАЗКІ...

З 1 снежня да 15 студзеня ў сталіцы пройдуць мерапрыемствы, прысвечаныя святкаванню Новага года. Масавыя гулянні разгорнуцца на 24 пляцоўках. Пра гэта паведаміў намеснік начальніка ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама Аляксандр ШАСТАКОЎ.

— У кожным раёне адбудуцца канцэртныя праграмы, навагоднія прадстаўленні, спартыўныя спаборніцтвы і іншыя забавы. З 14 снежня на пляцоўцы каля Палаца спорту і на Кастрычніцкай плошчы адкрыецца святочны «Калядны кірмаш». У Верхнім горадзе на Нямізе з 28 снежня да 5 студзеня каля ратушы можна будзе ўбачыць казачны спектакль «Чароўная скрыначка Дзеда Мароза»: 28 снежня — у 20.00, з 29 снежня да 5 студзеня — у 17.30 і 20.00. Шэсце Дзядоў Марозаў і Снягурак стартуе 28 снежня ў 17.00. Каля тысячы яго ўдзельнікаў пройдзе па традыцыйным маршруце ад плошчы Незалежнасці да Кастрычніцкай плошчы. Завершыцца парад прадстаўленнем музычнай казкі «Навагодні зарапад».

Аляксандр Шастакоў адзначыў, што ў навагоднюю ноч гулянне пачнецца за паўгадзіны да поўначы, старт — на Кастрычніцкай плошчы. Завершыцца яно ў чатыры гадзіны раніцы. Навагодні феерверк можна будзе ўбачыць на пляцоўцы каля Палаца спорту ў 1.30 ночы, працягнецца ён 11 хвілін у суправаджэнні лазернага шоу. Далей пачнецца насычаная музычная праграма, у якой возьмуць удзел папулярныя беларускія спевакі і дыджэі.

У сталіцы для дзяцей і падлеткаў запланавана больш за 550 навагодніх мерапрыемстваў. Пра гэта паведаміла **намеснік начальніка аддзела выхаваўчай і ідэалагічнай работы камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Надзея ВЯЛІКАЯ.**

— 24 снежня пройдзе Галоўная ёлка краіны, на якой традыцыйна будзе прысутнічаць кіраўнік дзяржавы. Свята ў Палацы Рэспублікі збярэ больш за 1500 дзяцей. Упершыню ў сталіцы на базе Палаца дзяцей і моладзі 21 снежня адбудзецца «Навагодні баль у Палацы». Яго госці — навучэнцы 11 класаў, каледжаў і прадстаўнікі ВНУ. Навагодняя дабрачынная акцыя «Нашы дзеці» запланавана ў краіне з 9 снежня да 10 студзеня.

У зімовы перыяд у горадзе плануецца шмат спартыўных мерапрыемстваў. Аб іх арганізацыі расказаў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення спорту і турызму — начальнік аддзела фізкультурна-аздараўленчай работы і турызму Мінгарвыканкама Васіль КАСАЧ.**

— Для дзяцей і падлеткаў з 2 да 10 снежня пройдуць спаборніцтвы па хакеі «Залатая шайба». З 9 да 15 снежня на базе «Чыжоўка-Арэны» адбудзецца чэмпіянат свету па хакеі сярод маладзёжных камандаў. Калядны міжнародны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Беларусі запланаваны з 3 да 7 студзеня. Акрамя таго, на гарадской лыжароллернай трасе «Вяснянка» з 23 да 25 студзеня будуць арганізаваны спаборніцтвы па біятлоне «Снежны снайпер», у лютым — спартыўнае свята «Мінская лыжня». Дакладная дата яго правядзення будзе вызначана ў залежнасці ад умоў надвор'я. Спартыўна-масавыя мерапрыемствы пройдуць і ў раёнах сталіцы.

Васіль Касач нагадаў, што з надыходам устойлівай мінусавай тэмпературы ў Мінску пачнуць працаваць 48 адкрытых каткоў. Таксама ў кожным з раёнаў горада будуць месцы для катання на цюбінгах.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Бяспека руху

АЎТО ПАТРАБУЕ ЗІМОВЫ «АБУТАК»

З першага снежня кіроўцы павінны «пераабуць» свае аўтамабілі ў зімовыя шыны. Пра гэта нагадала старшы інспектар па асаблівых даручэннях аддзела арганізацыі міжведамаснага ўзаемадзеяння і прапаганды бяспекі дарожнага руху УДАІ МУС Ганна БАНАДЫК.

— Зімовыя шыны ўстанаўліваюцца на ўсіх колах транспартнага сродку. Пры іх куплі неабходна звяртаць увагу на маркіроўку. Патрэбны прамаркіраваныя знакам у выглядзе горнай вяршыні з трыма пікамі і са сняжынкай унутры ці знакамі M і S, — паведаміла яна.

Інспектар адзначыла, што з першага снежня да першага сакавіка за ўдзел у дарожным руху транспарту на летніх шынах прадугледжана адміністрацыйная адказнасць — папярэджанне або штраф да 0,5 базавай велічыні. Таксама забаронены выезд на дарогу машын са зношаным пратэктарам, вышыня малюнка якога складае менш за чатыры міліметры. Такое парушэнне цягне папярэджанне або штраф у памеры да адной базавай велічыні.

Як стала вядома, у Правілах дарожнага руху ў частцы пераходу пешаходамі праезнай часткі абмяркоўваюцца змены. Падстава для іх — павелічэнне колькасці наездаў на пешаходаў у зімовы перыяд.

— У краіне толькі ў лістападзе ў дарожна-транспартных здарэннях атрымалі траўмы 263 чалавекі, 45 загінулі, большасць з іх — пешаходы. Таму трэба мець на ўвазе, што пры пэўных умовах надвор'я аўтамабілі не могуць затармазіць своечасова, асабліва на ажыўленай трасе, паблізу пешаходаў, на скрыжаваннях, дзе ад частага набору хуткасці і тармажэння ўтвараецца галалёд. Важна нават на рэгуляваных пешаходных пераходах пераконвацца, што транспарт паспеў спыніцца. Дарэчы, варта паклапаціцца і пра надзейную абарону ад траўмаў і здарэнняў, — пра флікеры, — нагадала Ганна Банадык.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Тонкая грань

Выйшлі на першы лёд...

На Сожы дасталі з вады двух мужчын-рыбакоў.

Ранкам ратавальнікам Чачэрскага падраздзялення МНС ад мужчыны паступіла паведамленне аб тым, што на Сожы каля вёскі Гарадоўка тонуць два чалавекі.

Глыбіня ракі ў гэтым месцы даходзіць да шасці метраў. Жыхары вёскі Негаўка Буда-Кашалёўскага раёна выйшлі на першы лёд на сярэдзіну Сожа для лоўлі рыбы і праваліліся. Самастойна выбрацца не змаглі, паведамілі ў МНС. Ратавальнікі пры дапамозе выратавальнай дошкі даставілі пацярпелых на бераг і перадалі медыкам. Пасля агляду работнікамі аховы здароўя абодва вяскоўцы з папярэднім дыягназам «пераахаладжэнне» былі шпіталізаваны ў бальніцу.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Крымінал, здарэнні

БЕЗ СТРАХУ І СУМЛЕННЯ

У Брэсце асуджана чарговая махлярка, якая падманам выпрошвала грошы ў знаёмых і амаль незнаёмых людзей.

Кожны раз так жаласліва прасіла на лячэнне нованароджанага пляменніка, на дыягностыку маці ў сталіцы, на лячэнне сына-інваліда. І давалі па 500, 1000, 3000 долараў. Тых, у каго не было наяўных грошай, яна пераконвала аформіць на сябе крэдыт, некалькі месяцаў плаціла па ім, а потым пераставала выходзіць на сувязь. Спосабаў завалодаць чужымі грашыма 41-гадовая зламысніца мела процьму.

Галоўнае, што ўсе яе сваякі — жывыя і здаровыя. І не баіцца ж наклікаць на родных няшчасці! Але ў такіх людзей няма сумлення, сораму і боязі. Яны ставяць мэту ды крочаць да яе, не зважаючы на пачуцці і перажыванні іншых. Дзіўна толькі, няўжо спадзяюцца, што знаёмыя не будуць звяртацца ў праваахоўныя органы? Што ўжо тут казаць пра віртуальных прайдзісветаў, якія рабуюць пенсіянераў, спісваюць пенсію з іх банкаўскіх картак! Тыя не бачылі сваіх патэнцыйных ахвяр. Гэтая — бачыла, ведала, чай піла разам, за сяброўку сябе выдавала.

Асудзілі «сяброўку» да трох гадоў пазбаўлення волі, грошы абавязалі вярнуць. Нямала іх яшчэ ходзіць на свабодзе — тых, чые крэдыты гасяць знаёмыя, калегі, чые сумленна зароблены грошы нахабна прысвоілі такія вось махляры.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ГОСЦЬ НА ПРОВАДАХ РАЗГРАМІЎ КАВЯРНЮ

Пункт грамадскага харчавання ў Чашніках нядоўга цешыў наведвальнікаў абноўленым інтэр'ерам. А ўсё з-за 23-гадовага вяскоўца.

Малады чалавек разам з траюрадным братам быў запрошаны на провады ў войска свайго знаёмага. Каля дзвюх гадзін ночы градус весялосці дасягнуў мяжы, і паміж сваякамі пачалася сварка.

Вырашаць канфлікт яны адправіліся на ганак піцейнай установы. Там лаянка скончылася тым, што адзін з удзельнікаў прыгразіў другому выклікам міліцыі. Такая перспектыва не ўзрадавала маладога чалавека, і ён зайшоўся ў новым прыліве лютасці. Спаганяць зло ўдзельнік застолля пачаў на кавярні. Хуліган кулаком разбіў акно, а пасля пашкодзіў сцяну, паведамляе УУС Віцебскага аблвыканкама.

У выніку маладому чалавеку ўсё ж давялося пагутарыць з міліцыянерамі, а пасля — і са следчым. Цяпер у дачыненні да яго заведзена крымінальная справа за хуліганства.

Нагадаем, аналагічны выпадак нядаўна адбыўся ў Гродне, дзе група маладых людзей на провадах прыяцеля ў войска разнесла здымны дом.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПРАВАВАЯ АЛІМПІЯДА

Чатырнаццаты раз прадухіляюць імітаваны ўзброены канфлікт удзельнікі Міжнароднай юрыдычнай алімпіяды «Моладзь за мір», якая з 25 да 29 лістапада праходзіць у Мінску ў Міжнародным ўніверсітэце «МІТСО». Сёлета ў конкурсе па міжнародным праве для студэнтаў і магістрантаў удзельнічаюць прадстаўнікі больш чым 20 краін свету. Канкурсанты павінны паказаць веданне міжнароднага гуманітарнага права, розных аспектаў міжнароднага публічнага права, якія ўзнікаюць у межах ваенных канфліктаў, а таксама правоў чалавека і яго здольнасцяў прыстасавацца да зменлівага асяродку.

Сёння неабходна выпрацаваць новыя падыходы ў сферы гуманітарнага права, якія б улічвалі ўсе выклікі сучаснасці і якія б маглі рэальна ўплываць на сітуацыю ў свеце. І менавіта моладзь павінна ўдзельнічаць у гэтым, мяркуе **Міхаіл ОРДА, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі:**

— Алімпіяда — гэта наш унёсак у выбудоўванне канструктыўнага міжнароднага дыялогу і добрасуседскіх адносін паміж краінамі. Беларусь па праве лічыцца самай стабільнай дзяржавай у рэгіёне. Днямі міжнародная група экспертаў абнародавала даследаванні пра глабальны індэкс тэрарызму, і наша краіна прызнана самай бяспечнай. Сёння каля 40 краін свету вядуць ваенныя дзеянні, аднак прама ці ўскосна ў іх удзельнічае значна больш дзяржаў. І пры гэтым парушаюцца самыя важныя нормы і абавязкі гуманітарнага права.

Для студэнтаў заўжды важна быць гатовымі да больш складаных часоў. Нельга быць занадта дасведчаным і падрыхтаваным да канфліктных сітуацый, таму гэтыя спаборніцтвы — падстава для пробы сябе ў практыцы міжнароднага права, дадаў **Фларыян КНЭР, член журы алімпіяды (Германія).**

Ірына СІДАРОК.

«Тушы недакурак»

МНС праводзіць конкурс па стварэнні бяспечнай попельніцы

Як паказвае статыстыка, большасць пажараў з гібеллю людзей адбываецца з-за неасцярожнага абыходжання з агнём пры курэнні. Каб знізіць колькасць такіх здарэнняў і падысці да праблемы з іншага боку, у рамках рэспубліканскай акцыі «Не прапальваць сваё жыццё!» МНС праводзіць інавацыйны конкурс па стварэнні канцэпцыі бяспечнай попельніцы.

Ці можна знайсці спосаб не дапусціць наступстваў неасцярожнага курэння ў ложку і выкідання запалак і недакуркаў куды заўгодна, у тым ліку на матэрыялы, здольныя загарэцца пры найменшым судакрананні з агнём? Можна паспрабаваць, напрыклад, адмовіцца ад курэння. Але каб дапамагчы тым, каму такая барацьба (у першую чаргу з самім сабой) не па сілах, ратавальнікі ініцыявалі конкурс «Бяспечная попельніца», які дазволіць бок аб бок пазмагацца за бяспеку з гэтай згубнай звычкай.

Прыняць удзел у конкурсе можа любы ахвотны. Важныя задачы, якія трэба будзе вырашыць кожнаму ўдзельніку, — забяспечыць пажарную бяспеку пры курэнні ў любым месцы і становішчы і не даць забыць пра непатушаную цыгарэту. Галоўны пасыл, які павінен несці праект, — выклікаць жаданне ў курца патушыць свой недакурак і пазбегнуць бяды.

Няма ніякіх абмежаванняў і рамак для фантазіі. Адзіная ўмова — патрэбна, каб праект можна было ўвасобіць у рэальным жыцці.

Удзельнічаць у конкурсе і дасылаць свае работы можна на ssir@mchs.gov.by.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Сямейная газета

Выпуск № 17 (135)

КОПІЯ З КОПІІ

У школьны бацькоўскі чат прыйшло паведамленне ад настаўніцы: «Трэба зрабіць навагоднія цацкі для ёлкі ў школьнай бібліятэцы». Многія знаёмыя, бацькі вучняў малодшых класаў і выхаванцаў старэйшых груп у садках таксама атрымалі падобныя «дамашнія заданні», прычым у некаторых выпадках зацвярджаўся нават выгляд будучых цацак і выцінанак-сняжынак.

Што ж у гэтым дрэннага, скажаце вы, — падрыхтоўка да свята, творчасць, калектыўная работа галавой і рукамі, усё як мае быць. Так, ды не так. Падрыхтоўка — зразумела. Але дзе месца для творчасці, дзе прастора для фантазіі, калі табе даводзяць канкрэтныя ўзоры, памер і матэрыял? «Нам на клас трэба трыццаць аднолькавых сняжынак — такая канцэпцыя, — расказвае прыяцелька, — а часу і імпэту ні ў кога з бацькоў няма, так што вырашылі закупіць некалькі лістоў гатовых кітайскіх налепак, балазе імі ўсе кірмашы ўжо заваленыя...»

Тут, як гаворыць гераіня добра вядомага сучасным бацькам і дзецям мультсерыяла, раскажу я вам казачку. Ну, не тое, каб зусім казачку, быль, але не першай свежасці. Адным з выдатных педагогаў-арганізатараў, якога мне пашчасціла сустрэць у дзяцінстве, быў Уладзімір Валянцінавіч — ён вёў у нас у заводскім летніку «Усход» творчыя гурткі: асновы фотасправы і выпальванне па дрэве. І трэба сказаць, што чарга ахвотных запісацца да яго заўсёды збіралася ў першы ж дзень змены, нягледзячы на строгі і адказны падыход: усе тлумачэнні настаўніка ўважліва выслухаць, паўтарыць, тройчы адмераць і толькі потым прыступаць да работы. Так, на выпальванні мы самі выбіралі жаданыя малюнкі — мультперсанажаў, тэхніку, прынцэс, нацюрморты — некаторыя прыносілі і карцінкі з часопісаў, акуратна перамалёўваючы іх праз кальку. Потым знаходзілі сярод загатовак фанеркі патрэбнага памеру, апрацоўвалі іх з дапамогай педагога, пераносілі малюнак, у некалькі прыёмаў выпальвалі, расфарбоўвалі, пакрывалі лакам, а напрыканцы змены, шчаслівыя, забіралі дамоў і хваліліся бацькам. Але ведаеце, што ў гэтай справе было самае каштоўнае і прыемнае? Што твая работа чымсьці адрознівалася ад іншых — колерам або памерам дошкі, таўшчынёй выпаленых ліній, спосабам штрыхоўкі... Адпаведна і стаўленне да дошчачкі, якую ты ўласнаручна ператварыў, хай і ў сціплы, але твор мастацтва, было паважлівае і беражлівае.

Іншая рэч, калі за цябе практычна ўсё зроблена і трэба толькі выбраць у краме гатовы набор для творчасці: карціны па нумарах, малюнкі для выпальвання з аднаразовым прыборам, канструктары, мазаікі, лялькі з фетру, арыгамі, гравюры, самаробныя магніты, зборныя мадэлі і г. д. Для дзяцей, якія толькі пачынаюць займацца канструяваннем, выяўленчым ці дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам, гэта, безумоўна, карысна — каб наогул абудзіць цікавасць да творчасці, навучыць акуратнасці, паслядоўнасці і логіцы, засвоіць асноўныя прыёмы. Але не больш за тое. Каб насамрэч адчуць гармонію і прыгажосць, набыць індывідуальны стыль, адправіцца ў самастойны творчы палёт, трэба абавязкова выходзіць за межы прапанаваных трафарэтаў, шаблонаў і схем. Не верыце мне — паслухайце класіка. Леанарда да Вінчы прамым тэкстам казаў: «Жалю варты той вучань, які не перасягнуў свайго настаўніка». Словам, не заганяйце самі сябе ў рамкі бяздумнага капіравання, працавітыя кітайцы і сучасныя тэхналогіі нашмат хутчэй за вас зробяць мільён аднолькавых сняжынак. Дазвольце сабе, а тым больш дзецям, праявіць творчасць — і няхай нават першая выцінанка будзе крывая, але затое толькі ваша і на іншыя не падобная.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Тыя, хто побач

Уладзіслаў МІСЕВІЧ:

«Ніколі не позна стаць шчаслівым»

Праз 30 гадоў.

Яны распісаліся ў высакосным годзе, праз дваццаць гадоў фактычнага шлюбу, — і шчаслівыя.

Вольга і Уладзіслаў Місевічы нарадзіліся хоць і ў розныя месяцы, але ў адзін дзень — 8 чысла. У іх жыцці шмат і іншых цікавых супадзенняў, а разам яны ўжо больш за трыццаць гадоў.

А сёлета ў друк выйшла кніга ўспамінаў Уладзіслава Місевіча «Песняры. Я роман с продолженьем пишу...». Здавалася б, прыхільнікі і журналісты, якія грунтоўна ў тэме, усё ведаюць пра гісторыю «Песняроў». Але ж растыражавана і шмат таго, што не адпавядае рэчаіснасці... Цяпер жа вядома з першых вуснаў, як гэта было. Мабыць, мая любімая частка — тая, у якой Уладзіслаў Місевіч апавядае пра сваё паслявае-ннае дзяцінства, гісторыю сваёй сям'і, сабраную па крупінках, і асабістае жыццё. Паляк па пашпарце, у пэўны перыяд жыцця Уладзіслаў Людвігавіч разважаў: хто ён? Паляк, савецкі чалавек, на чвэрць беларус, бо і тут была радня? У перыяд, калі *«краіна і ансамбль, якія мне ўсё далі, адначасова руйнаваліся»*, ён усё-ткі ніяк не мог зразумець для сябе, кім стане за межамі Беларусі, і таму *«адусюль у лічаныя дні зрываўся ў Мінск»*. Хоць была магчымасць застацца і ў Маскве, і ў Нью-Джэрсі. Знаёмства з Вольгай паставіла кропку ў *«роздумах, хто я і дзе мне жыць»*.

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

Урокі выхавання

ХТО НАВУЧЫЦЬ... БЫЦЬ БАЦЬКАМІ І ДЗЕЦЬМІ?

Нестабільнасць сям'і, наяўнасць у ёй аднаго дзіцяці, вечны недахоп часу ў бацькоў, адсутнасць кантакту са школай і педагагічных ведаў у мам і тат... Усё гэта, на думку спецыялістаў, негатыўна ўплывае на выхаванне малых. Каб дапамагчы мамам і татам гадаваць сваіх нашчадкаў і падтрымліваць іх у гэтай справе, у школах краіны плануюць стварыць універсітэты бацькоўства. Ужо ў 7-8 класах школьнікаў мяркуюць навучыць будаваць узаемаадносіны з іншымі людзьмі і бесканфліктна вырашаць праблемы з дапамогай спецыяльных факультатываў. Усё гэта абмяркоўвалі спецыялісты з розных краін на міжнароднай канферэнцыі ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Сацыяльная кансультацыя

Дзелім водпуск на часткі

Спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны адказваюць на вашы пытанні.

Калі ў службу занятасці звяртаецца чалавек з інваліднасцю па дапамогу ў працаўладкаванні, ці абавязкова пры гэтым прадставіць індывідуальную праграму рэабілітацыі інваліда?

— Так. Рэгістрацыя грамадзян у якасці беспрацоўных з'яўляецца адміністрацыйнай працэдурай. У адпаведнасці з Пералікам адміністрацыйных працэдур, якія ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі па заявах грамадзян (зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 красавіка 2010 года № 200), пры звароце для рэгістрацыі ў якасці беспрацоўнага чалавек з інваліднасцю павінен прадставіць сваю індывідуальную праграму рэабілітацыі.

Без прадстаўлення гэтага дакумента наймальнік, згодна з артыкулам 26 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, не мае права прыняць інваліда на работу і заключыць з ім працоўны дагавор.

* * *

Ці можна водпуск, які даецца работніку-інваліду, падзяліць на дзве часткі?

— Згодна з часткай першай артыкула 174 Працоўнага кодэкса, па дамоўленасці паміж работнікам і наймальнікам працоўны водпуск можа быць падзелены на дзве часткі, калі іншае не прадугледжана калектыўным дагаворам, пагадненнем. Пры гэтым адна частка павінна быць не меншая за 14 каляндарных дзён.

Заканадаўствам не ўстанаўліваюцца абмежаванні для якіх-небудзь катэгорый работнікаў, у тым ліку для людзей з інваліднасцю, па падзеле водпуску на часткі. Такім чынам, працоўны водпуск работніка, які мае інваліднасць, можа быць падзелены на часткі ў парадку, устаноўленым часткай першай артыкула 174 Працоўнага кодэкса.

* * *

Ці можа быць падоўжаны сацыяльны водпуск без захавання заработнай платы, калі ў яго перыяд работнік захварэў і яму быў выдадзены лісток непрацаздольнасці?

— Не, не можа. Падаўжаецца або пераносіцца ў сувязі з надыходам часовай непрацаздольнасці работніка толькі працоўны водпуск (артыкул 171 Працоўнага кодэкса).

Але пасля закрыцця лістка непрацаздольнасці работніку можа быць дадзены чарговы сацыяльны водпуск ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.

Што ў кашальку

«ПАДУШКА» БЯСПЕКІ

Як траціць грошы з розумам?

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Ці заўсёды мы рацыянальна распараджаемся сваімі сродкамі? Бо як бывае — атрымаеш аванс, зарплату, а праз нейкі час ужо амаль пуста ў кашальку, дакладна і не згадаеш, куды колькі патраціў. Безумоўна, ёсць пункты расходаў, якія абавязковыя і паўтараюцца з месяца ў месяц. А вось калі размова заходзіць пра нечаканы бальнічны, зламаны тэлевізар ці абед з калегам, то тут якраз і ўзнікаюць траты, на якія не разлічвалі. Таму вядзенне бюджэту — гэта наш арыенцір у пытаннях фінансаў сям'і.

Існуюць розныя варыянты вядзення сямейнага бюджэту. Аднак не блытайце спосабы захоўвання сродкаў («канверты», «збанкі», «50/20/30») і фіксавання выдаткаў (ручны ці з дапамогай праграм на камп'ютары ці тэлефоне). Зрузумела, кожны з іх мае свае асаблівасці, перавагі і недахопы. Пачнём з самага простага — ручнога спосабу ўліку. Для яго спатрэбіцца сшытак і ручка: проста запісваем, што атрымалі і куды патрацілі, а ў канцы месяца падводзім вынікі і аналізуем. Асноўная заўвага — усе падлікі трэба таксама рабіць уручную, без прывязкі да камп'ютара і інтэрнэту.

Ведаю тых, хто аддае перавагу мабільным ці камп'ютарным уліковым праграмам. Сама была прыхільніцай такога варыянта, пакуль не «пачысціла» памяць у тэлефоне. Выбар спецыяльных праграм надзвычай вялікі, але не заўсёды бясплатная версія адпавядае нашым патрабаванням: камусьці не хапае магчымасці весці разлікі ў розных валютах, для кагосьці не надта поўна адлюстраваны катэгорыі выдаткаў. Зручна, што дастаткова ўсталяваць праграму, і ў любы момант занатоўваеш паступленне грошай і траты, а потым у канцы месяца глядзіш, якім чынам іх можна аптымізаваць. Напрыклад, калі шмат грошай ідзе на інтэрнэт і мабільную сувязь — варта дабраць новыя тарыфныя планы.

Ад уліку пяройдзем да спосабаў размеркавання грошай у бюджэце. Адна мая знаёмая практыкуе метад «канвертаў». «Такі спосаб размеркавання мне найбольш імпануе. Бо як бывае? То забудзеш улічыць нейкую дробную пакупку, то зусім класічны выпадак — «заглючыў» тэлефон, і ўся інфармацыя знікла... Камп'ютарная ж праграма, якую на той час я знайшла для вядзення дамашняй бухгалтэрыі, не была разлічана на сям'ю з дзецьмі. Таму «канверты» аказаліся самай жыццяздольнай сістэмай, — дзеліцца Вікторыя. — У мяне іх шэсць: «побыт», «транспарт», «адпачынак», «абавязковыя плацяжы», у сезон — «нарыхтоўкі» і не так даўно з'явіўся яшчэ адзін — «форс-мажор», у яго мы адкладаем грошы на нейкія непрадбачаныя траты, дзе, напрыклад, набыццё лекаў, паход у цырульню і гэтак далей. Што да тых жа камунальных і іншых плацяжоў, тут я гляджу, якія трэба аплаціць наяўнымі, а на якія пакінуць грошы на картцы. Але ўсё фіксую яшчэ і ў спецыяльным блакноце. Таму ў канцы месяца маю наглядную карціну, куды і якія грошы ідуць».

Спосаб размеркавання бюджэту па «збанках» з'яўляецца варыяцыяй метаду «канвертаў». Грошы раскладаеце ў шэсць збанкоў. У першы — 55 % заробку на паўсядзённыя выдаткі і аплату розных плацяжоў. Другі — для адпачынку, і туды можна пакласці толькі 10 %. Калі гэтая сума будзе патрачана, то давядзецца шукаць бясплатныя магчымасці для адпачынку. Трэці збанок адводзім пад зберажэнні, і ў яго адкладваем зноў жа 10 %. Чацвёрты — выдаткі на адукацыю (курсы, кнігі — найлепшая інвестыцыя ў сябе), туды таксама ідзе 10 %. Збанок пад пятым нумарам будзе рэзервовым фондам, дзе назапашваем грошы штомесяц для нейкай вялікай пакупкі, напрыклад аўто, новай мэблі ці ноўтбука. І на іх адкладаць 10 % зароблених грошай. Нарэшце, шосты збанок — у яго кладзём 5 % — на падарункі і дабрачыннасць. Згадзіцеся, задача набыць прэзент на невялікую суму дае добры штуршок фантазіі.

Ёсць яшчэ варыянт, калі грошы размяркоўваюцца ў працэнтах у суадносінах 50/20/30: і калі палова заробку ідзе на плацяжы, ежу, праезд і іншыя важныя выдаткі, то зусім нечаканай з'яўляецца лічба 30 % у дачыненні да такой катэгорыі, як «адпачынак» (у гэтай канцэпцыі яна называецца «стыль жыцця» і мае на ўвазе ўкладанні ў сябе), а 20 % — на забеспячэнне сабе фінансавай незалежнасці ў перспектыве. Варыянт цікавы, але, на маю думку, не зусім практычны для сям'і.

— Калі казаць пра сямейны бюджэт, то ён мае чатыры функцыі: улік, аналіз улічанага, планаванне на аснове ўліку і аналізу ды кантроль за тым, як усё выконваецца. Планаванне будзе правільным у тым выпадку, калі маюць адлюстраванне ўсе функцыі. Спосабы для гэтага існуюць самыя розныя, варта спрабаваць і шукаць той, у якім вам будзе камфортна, — мяркуе **фінансавы кансультант Святлана МУРАШКА.** — На пытанне, наколькі важна планаваць і размяркоўваць сямейны бюджэт, адказ у кожнага свой. Бо нехта зарабляе дастаткова, каб ні ў чым сабе не адмаўляць, і гэта адна сітуацыя. А іншая — калі людзі маюць, напрыклад, нейкія крэдытныя абавязацельствы альбо ў іх ёсць мэта назбіраць на жыллё, вучобу дзецям: тады без планавання будзе складана. Усё індывідуальна, аднак чым раней людзі пачынаюць уважліва ставіцца да сваіх грошай, тым лягчэй ім будзе ў нейкія паваротныя перыяды жыцця (калі захварэлі альбо хочаце змяніць работу і г. д.). Бо чалавек, які мае фінансавую «падушку» бяспекі, заўсёды будзе адчуваць сябе больш упэўнена.

Алена ДРАПКО.

Прававая гасцёўня

ВЯРНІЦЕ МУЖА З ДАЧКОЙ!

«Мой муж — фін. На лета ён паехаў з нашай 10-гадовай дачкой адпачыць да сябе на радзіму. Пачалася школа, а яны так і не вярнуліся. Ён кажа, што Паліна прывыкла, збіраецца вучыцца ў Фінляндыі, вяртацца не хоча. Пагаварыць з ёй ён мне не дае. Ці можна прымусіць яго вярнуцца ў Беларусь разам з дачкой? Я ж не пагаджалася на тое, каб яна там засталася жыць».

Надзея М., Мінск

— Беларусь з'яўляецца ўдзельнікам Канвенцыі аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага выкрадання дзяцей ад 25 кастрычніка 1980 года. Гэты дакумент скіраваны на забеспячэнне неадкладнага вяртання непаўналетняга ў краіну пастаяннага пражывання, калі ён быў вывезены адным з бацькоў у іншаземную дзяржаву з парушэннем правоў апекі або доступу другога з бацькоў, — тлумачыць **Марына ЖАНДАРАВА, начальнік аддзела выканання міжнародных дагавораў упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі.** — Той з бацькоў, хто перамяшчае малога за мяжу без згоды другой «паловы», парушае права дзіцяці на стасункі з абодвума бацькамі, якое замацавана ў Канвенцыі аб правах дзяцей. Калі дамовіцца паміж сабой мірна не атрымліваецца, перш за ўсё дзеля інтарэсаў дзіцяці, пачынаюць дзейнічаць механізмы Канвенцыі.

Вы маеце права звярнуцца з заявай аб вяртанні дзіцяці, калі дзяржава, куды перавезлі дзіця, з'яўляецца ўдзельнікам Канвенцыі. (Беларусь далучылася да Канвенцыі аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага выкрадання дзяцей у 1997 годзе.)

Форма заявы аб вяртанні дзіцяці змешчана на сайце Міністэрства юстыцыі («Дзейнасць» — «Міжнароднае супрацоўніцтва» — «Міжнародная прававая дапамога» — «Канвенцыя аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага выкрадання дзяцей ад 25 кастрычніка 1980 года»: https://minjust.gov.by/directions/international_cooperation/icd-lev2-4/icd-lev3-4).

Заявы і дакументы да яе павінны суправаджацца перакладам на афіцыйную мову дзяржавы, якая запытваецца. Пакет дакументаў трэба накіраваць у Мінюст для наступнай перадачы яго кампетэнтнаму органу іншаземнай дзяржавы, дзе знаходзіцца дзіця, альбо можна самастойна накіраваць іх адразу ў адпаведную ўстанову ў Фінляндыі.

Папярэджу, што адзін з бацькоў або асоба ці арганізацыя, якія маюць права апекі адносна дзіцяці, могуць звярнуцца з заявай аб вяртанні непаўналетняга пры адначасовым выкананні наступных умоў. Дзіцяці не споўнілася 16 гадоў. Перад вывазам за мяжу яно стала пражывала ў краіне — удзельніцы Канвенцыі і перамешчана ў іншую дзяржаву, якая таксама ўдзельнічае ў Канвенцыі. (Фінляндыя — удзельнік Канвенцыі, як і больш за 100 іншых краін свету.) На момант перамяшчэння правы апекі адносна дзіцяці ажыццяўляліся эфектыўна або маглі б здзяйсняцца, калі б малога не вывезлі.

Прымаючы рашэнне аб вяртанні, суды ўлічваюць такія моманты, як працягласць і перыядычнасць, умовы і прычыны знаходжання дзіцяці ў дзяржаве і пераезд сям'і ў гэтую краіну. Прымаюцца да ўвагі таксама нацыянальнасць малога, веданне мовы, сямейныя і сацыяльныя сувязі дзіцяці ў дзяржаве.

З дзесяці гадоў, дарэчы, суд ужо можа ўлічваць жаданне самога дзіцяці наконт таго, з кім з бацькоў яно хоча застацца. Разам з іншымі абставінамі меркаванне малога будзе ўлічвацца судом пры вынясенні рашэння.

Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. Разам са спецыялістамі Мінюста і іншых ведамстваў мы будзем шукаць на іх адказы.

ХТО НАВУЧЫЦЬ... БЫЦЬ БАЦЬКАМІ І ДЗЕЦЬМІ?

У адным кірунку... ці ў розных?

Сям'я — найважнейшы інстытут, з якім чалавек судакранаецца практычна ўсё жыццё. Яе каштоўнасць застаецца прыярытэтнай для беларусаў. Пра гэта сведчыць агульны каэфіцыент шлюбнасці — адзін з самых высокіх сярод еўрапейскіх краін. Павялічваецца і склад сем'яў — летась каля 60 % немаўлят былі не першыя па ліку ў бацькоў. У краіне больш за 106 тысяч шматдзетных сем'яў. Беларусь займае высокую пазіцыю (34-е месца сярод 179 дзяржаў) у рэйтынгу краін шчаслівага дзяцінства Незалежнай міжнароднай арганізацыі «Выратуем дзяцей», сцвярджаюць спецыялісты.

Разам з тым існуе шэраг праблем, якія патрабуюць вырашэння.

— *У прыватнасці, гэта нестабільнасць інстытута сям'і і шлюбу — летась на тысячу шлюбаў прыйшлося 546 разводаў. У выніку больш за 25 тысяч дзяцей засталіся без аднаго з бацькоў,* — сцвярджае **Аляксандр ЖУК, рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта.** — *Мы назіраем і зніжэнне маральнай адказнасці бацькоў за ўтрыманне і выхаванне дзяцей. Адсюль шмат сацыяльных сірот. Недастатковая і псіхолага-педагагічная падрыхтоўка моладзі да сямейнага жыцця.*

Змены, якія адбыліся ў жыцці грамадства, прывялі да парушэння ўзаемасувязі ў некалі трывалай сістэме: школа—сям'я—грамадскасць—вытворчасць. А новыя арганізацыі дапамогі сям'і — клубы, цэнтры, кансультацыі — недастаткова распаўсюджаны, кантакты з такімі ўстановамі маюць разавы характар. Таму асноўнай рэальнай структурай, здольнай аказваць дапамогу сям'і, застаецца школа, упэўнены **Аляксандр КАДЛУБАЙ, намеснік міністра адукацыі:**

— *Сям'я ўплывае на дзіця штодня, таму мае амаль неабмежаваныя магчымасці фарміравання яго асабістых якасцяў. Аднак часта сям'я і школа ўздзейнічаюць на малога рознанакіравана, а гэта прыводзіць да сацыяльнай канфрантацыі і ўзаемнага непаразумення. Спектр узаемадзеяння школы і сям'і звузіўся да пытанняў навучання, паводзін школьніка і матэрыяльнай падтрымкі ўстаноў адукацыі. Аднак без дапамогі сям'і школа не забяспечыць належных вынікаў выхавання.*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Аляксандр ЖУК, рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта.

Бацькі павінны ўмець аналізаваць дзейнасць і паводзіны сваіх дзяцей і выхоўваць іх, упэўнены навукоўцы. Яны настойваюць на неабходнасці работы па павышэнні псіхолага-педагагічнай культуры бацькоў, для чаго па ініцыятыве БДПУ будзе распрацавана і ўведзена ў школах краіны праграма бацькоўскіх універсітэтаў як сістэмы работы з татамі і мамамі. Важна ўбачыць гэтую работу ад бацькоў першакласніка да выпускніка, падкрэсліў намеснік міністра.

Універсітэт — у кожнай школе

Вырашыць праблему фарміравання псіхалагічнай культуры вучняў, прынамсі, міжасабовыя канфлікты паміж школьнікамі, закліканы факультатывы для навучэнцаў 7—9 класаў па асновах псіхалогіі.

— *Трэба пашырыць падрыхтоўку па спецыяльнасці «Сацыяльная і псіхолага-педагагічная дапамога». У краіне сёння недахоп сацыяльна-педагагічных псіхолагаў,* — кажа Аляксандр Кадлубай. — *Неабходна ўмацаваць практыка-арыентаваную падрыхтоўку педагогаў, пашырыць аб'ём практыкі будучых педагогаў у школах, праводзіць больш заняткаў са студэнтамі ва ўстановах адукацыі. Важна падняць на новы ўзровень работу раённых навукова-метадычных аб'яднанняў і педагогаў па фарміраванні псіхалагічных ведаў, рабоце з дзецьмі і ўзаемадзеянні з бацькамі.*

Рэктар педуніверсітэта расказаў, што робіцца для вырашэння бацькоўска-дзіцяча-школьных праблем. Напрыклад, праект «Здаровая сям'я — здаровая нацыя», зладжаны ў 2016—2018 гадах універсітэтам сумесна з Беларускім саюзам жанчын, меў на мэце сфарміраваць у грамадстве каштоўнасці сямейных адносін і адказнасць за нараджэнне і выхаванне дзяцей. Актуальныя вынікі праекта ўжо ўкараняюцца ў практыку работы школ і ўстаноў сацыяльнай абароны насельніцтва.

Фарміраванню каштоўнасцяў сям'і паспрыяў і рэспубліканскі ўрок сямейнага жыцця напярэдадні Дня маці. Старшакласнікам уручылі памяткі «Табе, будучы сем'янін». У некаторых школах у выпускных класах выкладаецца факультатыў «Асновы сямейнага жыцця». Штогод праводзіцца конкурс творчых работ «Гімн маці». У педуніверсітэце працуе клуб «Сям'я», а таксама суполка «Гарманічная сям'я» ў сацыяльнай сетцы «УКантакце».

— *Нашы вучоныя распрацавалі праграму трохступеньчатага ўніверсітэта бацькоўскіх ведаў. Першая прыступка — «Маё дзіця — малодшы школьнік», другая — «Маё дзіця — падлетак», трэцяя — «Маё дзіця — старшакласнік». Важна, каб Міністэрства адукацыі падтрымала стварэнне такіх універсітэтаў у кожнай школе,* — падкрэсліў Аляксандр Жук. — *Найважнейшы кампанент падтрымкі бацькоўства — падрыхтоўка педагогаў да работы з сям'ёй, і мы за апошнія тры гады стварылі ва ўніверсітэце рэсурсны цэнтр, які забяспечвае сучасную падрыхтоўку педагогаў. Перш за ўсё гэта рэспубліканскі цэнтр сацыяльна-педагагічных тэхналогій, на базе якога праведзена ўжо звыш 40 семінараў для педагогаў і псіхолагаў. Сёлета створаны рэспубліканскі цэнтр псіхалагічнай дапамогі, які дапамагае вырашаць дакладныя праблемныя сітуацыі навучэнцаў, студэнтаў, бацькоў і педработнікаў.*

Любоў выратуе свет

Навучанне і выхаванне — адзіны адукацыйны працэс, лічаць педагогі. Зірнуць на яго з іншага боку прапанаваў **Фёдар ПОЎНЫ, настаяцель Усіхсвяцкага прыхода,** які мяркуе, што «настаўнік навучае дзяцей, а святар выхоўвае душы, і нам па дарозе». Ён падзяліўся сваімі думкамі пра выхаванне патрыятызму і любові да малой радзімы, а таксама пра ролю сучаснага настаўніка ў жыцці вучняў:

— *Патрыятызм не нацыянальны. Аднак пры гэтым ён не касмапалітычны. Патрыятызмам нельга назваць любоў да дзяржавы як да пэўнага палітычнага ладу. У той жа час гэта не проста прывязка да месца нараджэння. Мне думаецца, любоў да зямной айчыны мае адну прыроду з любоўю да бацькоў. Ды і ў цэлым патрыятызм — гэта пра любоў, пра пачуцці. Бацькоў любяць не за штосьці, а за дар жыцця. Маці і бацьку забаронена не любіць. Нават калі нам здаецца, што яны несучасныя, адсталыя. Яны далі нам шанц стаць святымі. Я так шмат гавару пра любоў, бо ў школе пра яе не гавораць.*

Каб умець безумоўна любіць сваіх бацькоў, трэба, каб наша пакорлівасць была вышэйшая за наш гонар, сцвярджае святар. Ён заклікае паказваць сваім дзецям уласны прыклад, праяўляючы любоў і павагу да маці, якая, скажам, не маючы вышэйшай адукацыі, павучае сына-прафесара.

Фёдар ПОЎНЫ, настаяцель Усіхсвяцкага прыхода і Аляксандр КАДЛУБАЙ, намеснік міністра адукацыі.

— *Дзецям у школе кажуць пра правы, але не гавораць пра адказнасць, у тым ліку духоўную. Трэба, каб каштоўнасць жыцця як такога ў нашай дарослай свядомасці не вымяралася камфортам і дабротамі. На якія каштоўнасці раўняцца моладзі? Дзяцей не ўцягваюць у вучобу, работу, дабрачыннасць. Іх забаўляюць. І ў шэсць гадоў, і ў шаснаццаць. І настаўнік становіцца не тым, хто перадае каштоўнасці, а часта ператвараецца ў цыркача, акцёра, пастаўшчыка паслуг. А «каштоўнасці», якія прапаведуе інтэрнэт, — гэта спажыванне, распуста і ганарлівасць.*

Сям'я ці дом састарэлых?

Клапоцячыся пра дзяцей, нельга забываць, што ўсе бацькі з часам старэюць, і ўжо дзецям даводзіцца даглядаць іх. Пажылых робіцца ўсё больш, і не толькі ў Беларусі. А клапаціцца пра іх досыць складана, асабліва пра тых, хто пакутуе на дэменцыю. Пра вопыт клопату аб пажылых людзях у Германіі расказала гератолаг **Хелена ІГНАЦЫ, віцэ-прэзідэнт Евангелічнай вышэйшай школы прыкладных навук Нюрнберга (Германія).**

Яны, як правіла, застаюцца жыць у сем'ях, і маладзейшыя члены сям'і вымушаны шукаць шляхі, каб клапаціцца пра іх. Ці то кідаць работу, бо такі чалавек патрабуе пастаяннага догляду, ці то ўладкоўваць яго ў дом састарэлых, якіх у краіне, як і сацыяльных спецыялістаў, здольных аказваць кваліфікаваную дапамогу, недастаткова.

— *Каля 20 % насельніцтва Германіі старэйшыя за 65 гадоў. А працягласць жыцця ў сярэднім 85 гадоў. Кожны трэці састарэлы пакутуе ад дэменцыі. У краіне існуе страхоўка па доглядзе, каб пакрываць расходы на спецыялістаў, аднак іх усё роўна не хапае, бо клапаціцца пра такіх людзей трэба 24 гадзіны ў суткі,* — сказала прафесар Ігнацы. — *Сем'і вымушаны прыцягваць сядзелак з усходніх краін: Польшчы, Украіны, Славеніі. І часам гэта адбываецца нелегальна. Аднак нямецкія сем'і лічаць такое становішча вельмі зручным. Спецыялістам жа з-за мяжы падобная работа ад шасці тыдняў да трох месяцаў таксама даспадобы. Гэта добры варыянт для ўсіх, бо сем'ям не трэба адпраўляць бацькоў у дом састарэлых, дзе ўсё значна даражэй, а замежным спецыялістам можна плаціць да 1500 еўра ў месяц — адносна нямнога.*

Даследаванні, праведзеныя з прыцягненнем польскіх спецыялістаў, дазволілі высветліць умовы, асаблівасці і рызыкі такой работы. Аказалася, што большасць прыезджых не ведае нямецкай мовы і вывучае яе непасрэдна ў сям'і. Многія не валодаюць неабходнымі навыкамі па доглядзе за людзьмі з дэменцыяй, аднак мелі досвед клопату за ўласнымі бацькамі, 96 % з іх працуюць нелегальна і не могуць звярнуцца па падтрымку ні да кога, калі іх правы парушаюць. І ўсё ж большасць сядзелак кажуць, што будуць ездзіць на заробкі, пакуль у стане гэта рабіць і пакуль гэта патрэбна немцам.

Ад тэорыі да практыкі

Досведам работы па ўмацаванні інстытута сям'і ва Узбекістане падзялілася **Айніса МУСУРМАНАВА, загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі Узбекскага дзяржаўнага ўніверсітэта сусветных моў.**

Работа ў краіне вядзецца ў трох кірунках — дзяржаўная падтрымка, няўрадавыя арганізацыі і навукова-даследчая работа па ўмацаванні сям'і і падтрымцы жанчын.

— *Асаблівае месца займае рэспубліканскі цэнтр «Сям'я» пры кабінеце міністраў, які займаецца і навуковай, і практычнай работай,* — паведаміла яна. — *Цэнтр нанова створаны ўказам прэзідэнта ад 2 лютага 2018 года аб мерах па карэнным удасканаленні дзейнасці па падтрымцы жанчын і ўмацаванні інстытута сям'і. Да гэтага, з 1998-га, цэнтр функцыянаваў пры камітэце жанчын. Цяпер жа дырэктар Цэнтра прыраўноўваецца да міністра, а намеснік дырэктара — да намесніка міністра.*

Цэнтр каардынуе дзейнасць дзяржарганізацый і грамадскіх інстытутаў па рэалізацыі дзяржпалітыкі ў галіне сям'і. Асноўныя яго задачы — правядзенне фундаментальных, прыкладных і інавацыйных даследаванняў па пытаннях сям'і, рэпрадуктыўнага здароўя і дэмакратычнага развіцця, практычная рэалізацыя прапаноў, а таксама кансультатыўная і практычная дапамога сем'ям. Арганізоўваюцца і спецыяльныя курсы па падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі спецыялістаў па рабоце з сем'ямі.

У Цэнтры працуе 428 чалавек: юрысты, філосафы, гісторыкі, антраполагі, этнографы, медыкі, палітолагі, псіхолагі, эканамісты і іншыя, і гэта без уліку прыцягнутых вучоных і валанцёраў. Пры ім нават зарэгістраваны навуковы часопіс «Грамадства, гендар і сям'я ў Цэнтральнай Азіі».

Як бачым, у кожнай краіны свой шлях клопату пра дзяцей і бацькоў. Галоўнае, каб ён вёў да ўзаемаразумення.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

На нулі...

Як не «згарэць» падчас дэкрэтнага водпуску

Эмацыянальнае выгаранне — паняцце, якое ўпершыню выкарыстаў амерыканскі псіхолаг Герберт Фрэйдэнбергер сорак пяць гадоў таму. У той час, на думку доктара, з такім сіндромам сутыкаліся людзі, перагружаныя эмацыянальнымі зносінамі, — лекары, настаўнікі, сацыяльныя работнікі. Сёння існуе яшчэ адна катэгорыя людзей, якой добра знаёмае такое паняцце, як «выгаранне», ці «знясіленне», арганізма, — гэта мамы ў дэкрэце. Выраз «мама на нулі», напэўна, быў вядомы і раней, але неяк не было прынята гаварыць пра гэта ўслых. Некаторым жанчынам удавалася пераадолець такі стан, а іншыя маглі атрымаць нават псіхічнае расстройства — дэпрэсію. У Мінскім цэнтры сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей стараюцца дапамагчы жанчынам, якім патрэбна эмацыянальная падтрымка. Тут адкрылі групу «Майстэрства быць мамай», дзе дзеляцца спосабамі, як не «згарэць» падчас дэкрэту. Псіхолаг Цэнтра і вядучая групы Святлана НАЗАРАНКА расказала, як распазнаць знясіленне, дапамагчы самой сабе, а ў якіх выпадках ужо неабходна звяртацца да псіхіятра.

— Што называюць выгараннем у жанчын, якія знаходзяцца ў дэкрэце?

— Калі гаварыць пра бацькоўскае выгаранне, то яго можна патлумачыць як эмацыянальнае нервовае знясіленне, пастаяннае адчуванне стомленасці. З'ява звязана з парушэннем балансу «браць — даваць», гэта значыць, чалавек шмат выкладваецца, а чаканага выніку няма. Сёння праблема эмацыянальнага знясілення вельмі актуальная, бо грамадства патрабуе ад жанчын ідэальна выконваць ролю маці, гаспадыні, жонкі... Нават не патрабуе, а ёсць нейкая ўстаноўка наконт таго, якой павінна быць жанчына-маці: стрыманай, клапатлівай, дагледжанай, у доме — ідэальны парадак, і яна павінна абавязкова радавацца, маўляў, для гэтага ж і нараджала. Але, вядома, так не атрымліваецца: немагчыма быць ідэальнай на ўсе сто.

— А як бывае? Ці часта звяртаюцца жанчыны ў дэкрэце па дапамогу?

— На самай справе жанчыны быццам і разумеюць, што ідэальнай быць немагчыма, праўда, толькі розумам... Сэрцам і справамі пасля нараджэння любімага дзіцяці многія паступова набіраюць «абароты», хочуць дасягнуць тых ста працэнтаў у кожнай задачы: кармленні, прагулках, прасаванні дзіцячага адзення ці іншым.

Часцей за ўсё да нас прыходзяць падчас перыяду, які я называю «магу яшчэ пацярпець». Гэта калі ўсё дрэнна, жанчына ўжо не адчувае сваіх патрэб, а толькі мае слова «павінна» ў галаве.

Праз пэўны час, калі не дапамагчы, пачынаецца стадыя «сіл ужо няма», але ўсё роўна жанчына працягвае дзейнічаць, праўда, яна перастае жыць «тут і цяпер» — уяўляе ў галаве той час, калі малое засне, ці проста чакае канца дня. Такой маці ўжо не прыносяць радасць адносіны з дзіцем.

Некаторыя прыходзяць да нас ужо на стадыі «ўсе вінаватыя» — гэта калі жанчына «зрываецца», але ў гэтым яна лічыць вінаватымі іншых, напрыклад, дзіця праблемнае, муж няўважлівы ці іншыя блізкія. Такі стан яшчэ можна назваць станам ахвяры. Але на самай справе гэта ахоўная псіхічная рэакцыя, маўляў, я ўсё яшчэ «нармальная».

Далей надыходзіць стадыя акцэнту на негатыўных эмоцыях. Вынікам такога стану можа стаць дэпрэсія, калі ўжо патрэбна дапамога псіхіятра.

Праблема ў тым, што жанчыны забываюць простую ісціну: дзеці адлюстроўваюць стан маці. І таму немагчыма зрабіць дзіця шчаслівым, пакуль адчуваеш няшчаснай сябе. Калі мама не ў гармоніі з сабой, то дзіця не можа ад яе напоўніцца станоўчымі эмоцыямі. І чым меншае дзіця, тым больш яно знаходзіцца ў залежнасці ад настрою мамы.

— А як можа ў маці быць добры настрой, калі дзіця, напрыклад, нарадзілася «гучнае», а мама гэткі меланхолік, ці, наадварот, малое нарадзілася ціхім і спакойным, а мама халерык і не можа доўга сядзець на месцы — як кажуць, не сышліся характарамі?..

— Вядома, усе розныя, так задумана прыродай, і гэта трэба ўлічваць, пра гэта трэба заяўляць, прамаўляць сваім блізкім, таму што яны не чытаюць думкі, неабходна вучыцца гаварыць пра свае пачуцці. Але, на жаль, сёння я бачу іншую карціну. Жанчына «ставіць» сабе нейкую забарону на пачуцці: ёй здаецца, што трэба быць ва ўсім роўнай і спакойнай. Але гэта не карысна! Лепей дазволіць сабе быць «дастаткова добрай маці», а не ідэальнай. Разумееце, ідэал статычны, не мяняецца, не развіваецца... А «дастаткова добрыя» могуць дазволіць сабе быць жывымі. Не трэба рабіць ідэальны свет вакол дзіцяці, трэба вучыцца жыць побач, паважаючы характар адно аднаго, не ціснуць ні на сябе, ні на малое, а дапамагаць спраўляцца з перажываннямі. З любой эмоцыяй, якая ўзнікае ў чалавека, перад тым як «развітацца», трэба спачатку «павітацца». Іншымі словамі, прызнаць і расказаць пра гэта.

— Як навучыцца падтрымліваць сябе, калі няма сіл?

— Галоўнае — прыняць рашэнне выходзіць з гэтага стану. І першым крокам можа стаць клопат пра сябе, усведамленне, што ты і ёсць самы першы і галоўны чалавек у сябе. Навучыцца прасіць дапамогі, бо гэта на дзіва цяжка даецца нашым людзям, дэлегаваць абавязкі іншым, агучваць свае патрэбы перад сабой і іншымі, адсочваць першыя прыкметы незадаволенасці чымсьці, прагаворваць іх, а не чакаць выбуху гневу.

«Не трэба рабіць ідэальны свет вакол дзіцяці, трэба вучыцца жыць побач, паважаючы характар адно аднаго, не ціснуць ні на сябе, ні на малое».

У мяне некаторыя кліенткі выразна могуць сказаць, чаго хочуць і чакаюць ад іх сужэнец, дзеці, бацькі, грамадства, настаўнікі, але і сфармуляваць свае ўласныя патрэбы не могуць. Памятаю, прыйшла да мяне пара, дзе жанчына стала нервовая, маўляў, «выгарала» пасля нараджэння дзіцяці. Аказалася, маладая маці проста хоча спаць! Але яна нікога не прасіла пра гэта, проста рабіла «што трэба» суткамі без адпачынку. Далі ёй выспацца — і ўсё наладзілася. Але хто павінен сачыць за тым, каб яна высыпалася? Толькі яна сама. Муж быў у той сітуацыі гатовы і рады ёй дапамагчы. Таму другая парада «знясіленым» — памятаць пра свае базавыя патрэбы.

Ёсць некаторыя практыкаванні, каб дапамагчы сабе падчас дэкрэту і не застацца без рэсурсаў. Напрыклад, пакуль малое спіць ці глядзіць мульцікі, паляжаць 15 хвілін на падлозе, нібыта зазямліцца, і паразглядваць столь. Я матулям напамінаю пра гэта перыядычна, маўляў, «пыл ляжыць, і ты ляжы». Гэта дапамагае адцягнуць увагу ад хатняй мітусні.

Хоць у кожнай жанчынкі свая вітамінка. Некаму неабходны кубачак кавы ў цішыні, камусьці — пагартаць кнігу ці часопіс. Такія перапынкі трэба дазваляць сабе кожны дзень, таму што большая частка хатняй мітусні — у галаве.

Нельга забываць пра сваіх сябровак ці псіхолагаў, каб быў чалавек, з якім можна проста пагаварыць ці паскардзіцца. Некаторым дапамагае запісваць свае думкі ў дзённік.

— А што рабіць блізкім і сяброўкам, якія ўбачылі, што жанчына стамілася і знясілена?

— Слухаць! Слухаць безацэначна і без парад. У псіхолагаў гэта называецца «актыўнае слуханне». Прыняць пачуцці чалавека: маўляў, так, ты зараз стамілася, ты раззлавана. Канешне, ёсць сітуацыі, калі чалавек выгарае ад таго, што не можа прыняць пэўную жыццёвую сітуацыю, у якой аказаўся. І вось гэта «непрыняцце» забірае сілы. Тут лепш самому сябе пашкадаваць. А потым пастарацца змяніць характар думак: замест «за што мне гэта?» — «для чаго?», замест «мокнуць пад дажджом» — «гуляць пад дажджом». Нібыта змяніць пазіцыю ахвяры на пазіцыю аўтара сітуацыі.

Калі мама не ў гармоніі з сабой, то дзіця не можа ад яе напоўніцца станоўчымі эмоцыямі.

— Што важна ведаць жанчыне, якая знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску?

— Тое, што сама па сабе яна асоба ўнікальная, што, як і ўсе мы, яна мае права на любоў, і не трэба нікому даказваць, што ты харошая маці, жонка, дачка, сяброўка і г. д. Дзеці не нараджаюцца аднолькавымі, кожны малы — асобная планета, і нельга параўноўваць сваё дзіця з іншымі. Беражыце сувязь з сабой і не забывайце хваліць сябе за маленькія і вялікія перамогі, якія бачыце самі ў сабе толькі вы.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

vk.com

Мамін дзённік

МАЛЫ І ЯШЧЭ МЕНШЫЯ

Кажуць, калі ў сям'і, дзе падрастае дзіця, жыве нейкая жывёліна, то імунітэт у маленькага чалавечка мацнее. А таму і хварэць ён будзе радзей, чым яго равеснікі, якія бачаць катоў ці сабак у найлепшым выпадку толькі на вуліцы. Логіка ў гэтым ёсць. Дзіця знаходзіцца ў пастаянным кантакце з катом ці з сабакам, на поўсці, кіпцюрах, языку якіх заўжды хапае мікробаў. Імунітэт з маленства, такім чынам, да іх прызвычайваецца, а таму спакойна рэагуе на тыя ж бактэрыі, калі сустракае іх у іншым асяроддзі.

У маіх бацькоў, дзе мы з Арцёмкам пакуль праводзім большасць часу, жывёлы звяліся. Колькі сябе памятаю, у нас заўжды жылі каты, а апошнім часам нават па два. Я іх карміла, мыла, адпойвала з піпеткі, калі кацячая маці не хацела клапаціцца пра малых, выводзіла блох, лячыла, аплаквала іх заўчасную смерць і нават ладзіла «пахаванні». Апошняга ката Тошу, ужо вельмі старога і хворага, мой бацька адвёз у лес, калі той чарговы раз прынёс дахаты кляшча, якога акурат знайшоў Цёмік...

Я не супраць завесці новага гадаванца, але ў мэтах яго бяспекі давядзецца, відаць, пачакаць. Свякроўчыну кошку Арцёмка да таго заганяў, што тая, як толькі малы на парог, шукае, дзе схавацца. Варыянтаў няшмат, бо і на падваконніках, і пад сталом, і на трэльяжы Цёмік дастане... пластыкавай доўгай лыжкай для абутку.

Думала, што да маленькіх кацянят будзе іншае стаўленне (нават сур'ёзныя мужчыны часам млеюць, калі дакранаюцца да невялічкіх пухнатых камячкоў). Выпадкова трапілі на такога, рудога з белым, у горадзе каля шматпавярховіка. Нават не чакала, што рыдлёўка, з якой малы гуляе ў пяску, паляціць у гэтую безабаронную істоту. Я ўжо прызвычаілася, калі Цёмка цягае нічыйных катоў за хвасты, а тут не стрымалася, заступілася за камячка — лямант стаяў на ўвесь двор.

Насамрэч Арцёмка любіць жывёл. Падчас прагулкі з дзедам яны ніколі не абмінуць агароджу, за якой брэша суседскі Пушок. Малы абавязкова паганяе курачак і качак, захопіцца птушкамі, якіх, як яму, напэўна, здаецца, ён вось-вось ды зловіць.

Найбольш Цёмік сябруе з сабакамі — нездарма ў год гэтага гадаванца нарадзіўся. Пакуль навучыўся адрозніваць жывёл, усіх называў «га-га». Дагэтуль спіць з цацачным сабачкам — іх у яго ажно чатыры. То калыша іх у шэзлонгу, прыпяваючы «аа-аа», то возіць па чарзе ці запар у сваіх машынах. Дарэчы, да мяккіх цацак інтарэс у малога з'явіўся не так даўно. Працяглы час ён іх нават не заўважаў, а цяпер і спаць кладзе, і корміць, і пераносіць з пакоя ў пакой. А нядаўна, пакуль пілі гарбату ў гасцях, Цёмік незаўважна знік. Праз некалькі хвілін у кухні пачалі з'яўляцца плюшавыя мядзведзі (відаць, Арцёмка вырашыў, што ім таксама варта падсілкавацца).

Адным словам, як і большасць дзяцей, рана ці позна Цёмік папросіць нас набыць яму чатырохногага сябра. Я хачу спадзявацца, што гэта будзе не сабака (зусім не таму, што я іх не люблю, проста ў горадзе гэтым свабодалюбівым жывёлкам вельмі цесна). Шчыра сказаць, пакуль і на коціка не згодная. Можа, пачнём з хамячка ці марской свінні? Дарэчы, трэба паказаць Цёмку рыбак — а раптам спадабаюцца?!

Вераніка КАНЮТА.

«Ніколі не позна стаць шчаслівым»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

А вось як аб гэтым успамінае Вольга:

— Пазнаёміліся мы выпадкова. Забегла да сваёй сяброўкі, што называецца, у тапачках. А там яе кавалер са сваім сябрам. Я, вядома, чула «Песняроў», але Улада не пазнала. Калі сказалі, што гэта «пясняр», захапленне навіна ў мяне не выклікала. Прыгадала, колькі размоў хадзіла ў горадзе пра іншых артыстаў калектыву: той сустракаецца з адной, той расстаўся з другой... Мінск у 1987 годзе быў не такі ўжо вялікі горад, чуткі і плёткі хутка разыходзіліся. Праўда, пра Улада нічога такога не расказвалі, відаць, усе яго прыгоды здараліся на гастролях. А ў гасцях у сяброўкі мы з ім пагутарылі, і нешта мяне зачапіла. Думала, ненадоўга, а аказалася — на ўсё астатняе жыццё.

— Да сустрэчы ў вас абаіх ужо быў вопыт сямейнага жыцця...

— Да таго моманту я чатыры гады была ў разводзе, майму сыну Дзіму споўнілася шэсць гадоў. Улад тады таксама пару гадоў як разышоўся з жонкай. У яго ёсць дачка Караліна ад першага шлюбу. Нашы дзеці нарадзіліся ў адзін дзень — 24 жніўня, але з розніцай у 10 гадоў.

— Праз колькі часу пасля знаёмства згулялі вяселле?

У. М. — Праз дваццаць гадоў распісаліся. Трэба сказаць, вельмі многіх здзівілі, бо ўсе былі ўпэўненыя, што мы даўно ў афіцыйным шлюбе. Пра адсутнасць штампаў у пашпарце ведалі толькі вельмі блізкія людзі. Вяселля ў нас не было. Калі першы раз ажаніўся, спраўляў вяселле, і чым гэта скончылася? Адно добра: пазычыў у бабулі 200 рублёў на застолле, яна сказала, што давядзецца дажыць да таго часу, калі змагу аддаць. І дачакалася!

В. М. — Толькі Місевіч мог выбраць такі дзень — 29 лютага. Улад ехаў з калектывам з Масквы ў Брэст, выйшаў з цягніка ў Мінску, каб зайсці ў загс. Затым мы на машыне даганялі гурт, бо ў Брэсце быў канцэрт. З Брэста паехалі ў Віцебск — такое вось своеасаблівае вясельнае падарожжа. А «Беларускія песняры» выступалі і не ведалі, што пэўным чынам спяваюць на вяселлі.

— Вольга, не бянтэжыў вас усе гэтыя гады статус нявесты?

— Абсалютна не бянтэжыла адсутнасць штампа ў пашпарце. Для мяне значна важней, што адчувала я сябе замужам за каханым і надзейным чалавекам.

— А як у вас складваюцца адносіны з Каралінай?

— Дзеці заўсёды цяжка перажываюць развод бацькоў і раўнуюць да новых другіх палавінак. Караліна ставілася да мяне халаднавата. Я разумела яе пачуцці. Так атрымалася, што 15 гадоў пасля разводу Улад не размаўляў са сваёй былой жонкай Таццянай. Караліну гэта зусім не радавала. Ды і я лічыла, што з боку Улада гэта ўжо перабор, але ён упарты. З часам у мяне з Каралінай склаліся добрыя адносіны. Рада, што і нашы дзеці даўно сябруюць, Дзіма тэлефануе ёй і кажа: «Прывітанне, сястрычка».

— Уладзіслаў, ці хутка вы знайшлі агульную мову з Дзімам?

— Не скажу, што ўсё было бясхмарна, пару разоў сур'ёзна

Такімі яны пазнаёміліся.

канфліктавалі. Калі Дзіма скончыў школу, мы з Оляй, напэўна, як большасць бацькоў, выбралі інстытут, вырашылі, што юрыст — добрая прафесія для хлопца. Дзіма хутка зразумеў, што гэта не яго прызванне, і пайшоў служыць у войска. За абодва гэтыя ўчынкі паважаю сына. У арміі ён трапіў у ракетныя войскі, атрымаў правы прафесійнага кіроўцы. Пасля службы мы, зноў жа, думалі, што сыну неабходны дыплом, а Дзіма пайшоў працаваць на СТО, і вось гэта сапраўды яго справа, ён проста фанат аўтамабіляў. У майго цесця — залатыя рукі, ён мог змайстраваць усё што заўгодна. А Дзіма ў дзяцінстве часта круціўся каля дзеда, вось і адбілася спадчыннасць. Мне асабліва даспадобы, калі мае сябры адзначаюць, што Дзіма — выдатны майстар і прыемны ў зносінах чалавек. Для мяне Дзіма не толькі сын, але і сябар.

— А чым займаецца Караліна?

— Дачка скончыла харэаграфічнае вучылішча і спачатку выкладала ў школе рытміку, а сярод яе вучняў быў малодшы сын Мулявіна — Валера. Затым Караліна нейкі час працавала актрысай у прыватным драматычным тэатры. У пачатку 90-х усе імкнуліся паехаць працаваць за мяжу. Неяк дачка сказала, што ёсць магчымасць з'ехаць у Польшчу. Прызнаюся, падняў усе знаёмствы, каб пераканацца, што гаворка сапраўды пра танцавальны калектыў, ніякага падману. Тады са спакойнай душой адпусціў яе. З тых часоў яна жыве за мяжой. Танцавала ў Польшчы, Германіі, потым выйшла замуж за англічаніна. У дачкі выявіўся талент да замежных моў. Цяпер яна валодае польскай, нямецкай і англійскай. Ужо шмат гадоў жыве ў Англіі, даволі паспяхова займаецца рыэлтарскай дзейнасцю. Унуку Майклу Чарльзу 20 гадоў, ён студэнт... На жаль, з дачкой я меў зносіны не так шмат, як хацелася б. Калі яна ўжо жыла за мяжой, у мяне былі складаныя перыяды з фінансавага пункту гледжання, нават патэлефанаваць лішні раз не мог, не кажучы пра тое, каб з'ездзіць да яе. Цяпер, на шчасце, можам кантактаваць хоць штодня. Яна з сям'ёй прыязджала ў Беларусь, і мы не раз гасцявалі ў яе.

— Вольга, наколькі шыкоўнае было жыццё жонкі «песняра»?

— Першыя пяць гадоў нашага сумеснага жыцця былі не такія ўжо лёгкія. «Песняры» тады перажывалі не самы лепшы перыяд. Ва Улада ў калектыве была дадатковая нагрузка: адказваў за дысцыпліну, займаўся адміністрацыйнымі пытаннямі. Прыязджаў з гастроляў: бяссоніца, лекары. Тады «Песняроў» маглі закінуць на тры месяцы на гастролі ў Афрыку. Уражанняў, вядома, мора, а вось грошы артысты зараблялі ў асноўным для дзяржавы, а самі атрымлівалі сутачныя. Так што асаблівай раскошы не было.

— У 1992 годзе Уладзіслаў сышоў з «Песняроў» і заняўся бізнесам. Як тады змянілася ваша жыццё?

— Не вельмі яму падабалася гэта роля. Асабліва перажываў, калі яго называлі «былым «песняром». Што датычыцца грошай, то не так ужо і шмат іх было, раз-по-

лавек ажыў, колькі энергіі! Для мужчыны вельмі важна займацца любімай справай. Праз год ужо ўтварыліся «Беларускія песняры», і гэта быў вельмі добры перыяд у жыцці.

У. М. — У 1998 годзе мы думалі, што «Беларускія песняры» пражывуць гадоў пяць. Але ўжо адзначылі дваццацігоддзе. Усе гэтыя гады працуем у стабільным складзе. Галоўнае, што мы не забранзавелі, а ўвесь час шукаем нешта новае, імкнёмся зрабіць лепш і цікавей. Ды і з пункту гледжання заробку гэта быў удалы час. Толькі адзін штрых: у «Беларускіх песнярах» мы ўпершыню адправіліся за мяжу ў адпачынак, а не на гастролі.

— Уладзіслаў, у сваёй кнізе вы адзначалі, што да разбурэння першага шлюбу «прыклалі руку» і бацькі жонкі. А як бацькі Вольгі вас прынялі?

— Кажуць, калі хочаш даведацца, якая будзе твая жонка праз 20—30 гадоў, пазнаёмся з цешчай. Дык вось, калі ўбачыў Алену Дзмітрыеўну, канчаткова зразумеў, што Вольгу нельга адпускаць.

В. М. — Памятаеце, быў тэлеканцэрт «Беларускіх песняроў», прысвечаны 8 сакавіка? У ім удзельнічала і мая мама. Уладзік, трымаючы яе пад руку, віншаваў усіх цешчаў са святам. Наогул, ён любіць часам пахваліцца: «А цешча ў мяне, між іншым, Герой сацыялістычнай працы».

Злева направа, унізе: **сястра Вольгі Таццяна, нявестка Вольга, Алена Дзмітрыеўна, уверсе: Вольга, Дзіма і Уладзіслаў.**

раз нават даводзілася спрашчаць меню. Часам, мой заробак інжынера перавышаў даходы Улада. У бізнес жа трэба ўкладваць вялікую частку зарабленага. Ведаеце, Улад сыходзіў на работу ў восем раніцы, прыходзіў у пяць вечара. Здавалася б, мне трэба радавацца. Але я бачыла: бізнес — гэта не для яго. Ён гэта робіць, таму што трэба ўтрымліваць сям'ю. Вочы ў яго не гарэлі... Яго — гэта музыка. Таму не дзіўна, што як толькі з'явіўся пэўны прыбытак, Уладзіслаў разам з партнёрамі заснаваў дабрачынны фонд. Пяць навучэнцаў і пяць выкладчыкаў музычнага каледжа пры Акадэміі музыкі атрымлівалі стыпендыі.

У. М. — У той час рэктарам Акадэміі музыкі быў Міхаіл Казінец, і з ім таксама наладзілі супрацоўніцтва: заахвочвалі студэнтаў, якія перамаглі ў конкурсах, імкнуліся дапамагчы і настаўнікам-пенсіянерам. Для мяне гэта была аддушына, я адчуваў сябе патрэбным для музыкантаў.

— А як вы, Вольга, успрынялі той факт, што Уладзіслаў вяртаецца ў «Песняры»?

— Я радавалася. А Улад!.. Вы б яго тады бачылі: вочы гараць, ча-

— Колькі ў вас на дваіх унукаў?

В. М. — Чацвёра! Дзіма доўга не жаніўся, і мы нават на яго трохі насядалі, што хочацца ўнукаў. Так склалася, што сын ажаніўся са сваім першым каханнем, маёй цёзкай. Па маладосці яны расталіся, а праз 15 гадоў, як аказалася, пачуцці нікуды не сышлі. Оля да таго часу разышлася з мужам, у яе двое сыноў. Тры гады таму ў іх нарадзілася дачушка Каця. Вядома, у сыноў Олі ёсць родныя дзядулі і бабулі, але цяпер яны і нашы ўнукі таксама.

— Уладзіслаў, якую параду вы сённяшні, 74-гадовы, маглі б даць сабе 24-гадоваму?

— Нічога ніколі не позна. Канчаткова я сышоў з «Песняроў» у 1998 годзе, ва ўзросце 53 гадоў. Валерый Дайнека і Ігар Пеня маладзейшыя за мяне, але таксама былі ў тым узросце, калі калегі ў асноўным сыходзілі з эстрады. Мы працуем ужо 21 год у стабільным складзе, і даволі паспяхова. У асабістым жыцці тым больш ніколі не позна стаць шчаслівым чалавекам.

Аксана ЯНОЎСКАЯ, фота з асабістага архіва Уладзіслава МІСЕВІЧА.

З кнігі Уладзіслава Місевіча «Песняры. Я роман с продолженьем пишу...»

Жыллё прапанавалі мне і Шурыку Дзямешку — ужо сямейным і з дзецьмі. Мала таго, што бясплатна, дык яшчэ і з варыянтамі: нават тады гэта здавалася чымсьці немагчымым, асабліва пасля казармы і інтэрната. Хочаш, бяры ў цэнтры двухпакаёвую кватэру ў доме за оперным тэатрам, хочаш — у новым фондзе каля знакамітага Камароўскага рынку. Вядома, прасторная кватэра была ў цагляным доме каля тэатра, але старая, і прыводзіць яе ў парадак давялося б не адзін месяц. А каля Камароўкі — чысціня: новы дом, пяты паверх, шпалеры, фарба. Так і выбралі з жонкай аднадушна. Праўда, цяпер здаецца, што ўзровень мыслення ў нас быў яшчэ той: каб блішчэла і базар быў побач.

* * *

Бо што было ў мяне тут? Развёўся. Некалькі бязмэтных гадоў піў у інтэрнаце, а краіна і ансамбль, якія мне ўсё далі, адначасова разбураліся. Нават дзіўна, што пасля чарговых гастроляў патэлефанаваў сябру — журналісту і спартсмену Толю Літвінскаму: «Што, — пытаюся, — ёсць нармальныя дзяўчаты ў Мінску яшчэ?» — і павёў мяне Толя ў адну тэатральную сям'ю. Праўда, да тэатра мяне не пацягнула, калі ўбачыў суседку сямейства. Гэта была Вольга, мая будучая жонка, любімая Птушка. Яна і паставіла кропку ў маіх роздумах, хто я і дзе мне жыць.

* * *

Праўда, на сямейным жыцці такія перамены ніяк не адбіліся, да гонару маёй дарагой жонкі Вольгі. Яшчэ раней, калі канцэртаў было зусім мала, а заробкі ніякія, калі я маліўся на сваю пенсію, каб кудысьці выскачыць з замкнёнага кола «Песняроў», — ні адной прэтэнзіі, ні слова незадаволенасці. Да таго ж на тым ярка выражаным этапе спаду была падтрымка цешчы і цесця, Вольгіных сясцёр. І так да сённяшняга дня, толькі Анатоля Лаўрэнцьевіча ўжо не стала.

* * *

Што ў жыцці з'явілася з Птушкай? Сям'я — такая, як я хачу (нарэшце!). Ёсць адна фатаграфія, дзе мы з Оляй, яшчэ маленькі Мос (так Дзіму называю дома), Караліна прыехала. Я на гэты здымак у рамцы заўсёды глядзеў і думаў: вось і сям'я, з'явілася тое, чаго не хапала ў жыцці, тое, што было ў маіх бацькоў. Бо амаль усё маё жыццё прайшло спачатку ў казарме, у інтэрнаце, потым у калектыве. І жонка была, а сям'і не было. Цяпер усё ёсць, цяпер усё ў парадку.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 212 24-63-14, +375 29 510-07-63.

Продавец: открытое акционерное общество «Витязь» 210605, Витебская обл., г. Витебск, ул. П. Бровки, 13а, тел. +375 212 57-85-08.

Лот № 1. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 200/U-86275 площадью – 888 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17Б/4, готовность строения – 46 %. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 200/U-86269, площадью – 449,5 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17Б/1, составные части и принадлежности: две пристройки, готовность строения – 42 %, готовность двух пристроек – 62 %. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 200/U-86271 площадью – 288,6 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17Б/ 3, составные части и принадлежности: крыльцо, готовность строения – 68 %, готовность крыльца – 100 %. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 200/U-86273, площадью – 4722,8 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17Б/ 2, готовность строения – 39 %. Незавершенное законсервированное капитальное строение инв. № 200/U-86266 площадью – 1296,1 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17Б, составные части и принадлежности: пристройка, навес, готовность строения – 47 %, готовность пристройки – 52 %, готовность навеса – 74 %. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым № 240100000003000151 (договор аренды земельного участка по 14.08.2030) площадью 3,9294 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17Б, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания автотранспортного предприятия. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. **Начальная цена**: 1 187 738,53 бел. руб. без учета НДС. Задаток 118773,85 бел. руб.

Лот № 2 Кап. строение (одноэтажное металлическое здание склада газобаллонов (площадка 3) с инв. № 200/С-72741 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, д. 64В/1 площадью 173 кв. м, наименование – склад газобаллонов (площадка 3), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение (одноэтажное кирпичное здание КПП-18) с инв. № 200/С-71772 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, д. 64В/4, площадью – 22 кв. м, наименование – КПП-18, назначение – здание неустановленного назначения, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение с инв. № 200/С-78666 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, участок железной дороги Лучеса-Придвинская, 5 км, станция Журжево, подъездной железнодорожный путь № 33, протяженность – 299,8 м, наименование – подъездной железнодорожный путь № 33, назначение – сооружение специализированное железнодорожного транспорта, составные части и принадлежности: участок подъездного железнодорожного пути № 33, расположенное на зем. участках с кадастровыми №№ 240100000003007151, 240100000001000255, 240100000003007556. Кап. строение с инв. № 200/С-101966 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, телефонная канализация к зданиям №№ 64В, 64В/2, 64В/3, 64В/4, протяженность линейного сооружения – 343,3 м, наименование – телефонная канализация, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 200/С-101967 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, водопровод хозпитьевой к зданиям №№ 64В, 64В/2, 64В/3, протяженность линейного сооружения – 780,1 м, наименование – водопровод хозпитьевой, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. №200/С-101971 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, канализация хозфекальная от зданий №№ 64В, 64В/2, 64В/3, протяженность линейного сооружения – 445,4 м, наименование – канализация хозфекальная, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 200/С-101972 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, наружное освещение вблизи зданий №№ 64В, 64В/1, 64В/2, 64В/3, 64В/4, протяженность линейного сооружения – 429,4 м, наименование – наружное освещение, назначение – сооружение специализированное энергетики, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение с инв. № 200/С-101973 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, склад ГСМ вблизи здания № 64В, наименование – склад ГСМ, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, составные части и принадлежности: емкость, емкость, емкость, емкость, молниеотвод, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение с инв. № 200/С-101974 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, канализация ливневая от зданий №№ 64В, 64В/2, 64В/3, протяженность линейного сооружения – 970,6 м, наименование – канализация ливневая, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 200/С-102120 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, наружная теплотрасса к зданиям №№ 64В, 64В/2, 64В/3, 64В/4, протяженность – 306,9 м, наименование – наружная теплотрасса, назначение – сооружение специализированное энергетики, составные части и принадлежности: шесть участков сети, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение (двухэтажное панельное здание складского корпуса № 1 (площадка 3) с рампой) с инв. № 200/С-72898 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, д. 64В, площадью 2920 кв. м, наименование – складской корпус №1 (площадка 3), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: рампа, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение (двухэтажное смешанной конструкции здание складского корпуса № 2 с рампой) с инв. № 200/С-72749 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, д. 64В/2 площадью 2396 кв. м, наименование – складской корпус № 2 (площадка 3), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: рампа, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение (двухэтажное кирпичное здание склада ОМТС с бытовыми помещениями (корпус 3) с инв. № 200/С-72750 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, д. 64В/3 площадью 1883 кв. м, наименование – склад ОМТС с бытовыми помещениями (корпус 3), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение с инв. № 200/С-101970 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, д. 64 В, благоустройство территории, площадью 13216 кв. м, наименование – благоустройство территории, назначение – сооружение многофункциональное, составные части и принадлежности: проезжая часть, ограждение, трое ворот, две калитки, две крановые эстакады, громоотвод, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кран мостовой подвесной электрический КМПЭ-1,0 с инв. № 88400321, кран мостовой подвесной электрический КМПЭ-1,0 с инв. № 88400318, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, 64В/1. Кран мостовой подвесной электрический КМПЭ-1,0 с инв. № 95400420 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, 64В/2. Кран мостовой опорный электрический с кабиной 10-5К-14-12-У1 с инв. № 92400397, кран мостовой подвесной электрический КМПЭ-3,2 с инв. № 85400217, кран мостовой подвесной электрический КМПЭ-3,2 с инв. № 85400198, кран мостовой подвесной электрический КМПЭ-5 с инв. № 86400234, кран мостовой подвесной электрический КМПЭ-5 с инв. № 86400235, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, 64В. Имущество расположено на: земельный участок с кадастровым № 240100000001000255 (право постоянного пользования) по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, 64В; земельные участки с кадастровыми №№ 240100000003007151 (право аренды), № 240100000003007556 (право аренды) по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, 64. **Лот № 2 продается при условии продажи Лота № 1. В случае проведения нерезультативных торгов по Лоту № 1, Лот № 2 снимается с торгов.**

Начальная цена: 2 557 517,45 бел. руб. без учета НДС. **Задаток** 255 751,74 бел. руб.

Обременение по лотам № 1 и № 2: запрещение совершения регистрационных действий. Разрешение управления принудительного исполнения Главного управления юстиции Витебского облисполкома от 29.07.2019 на проведение аукциона при условии перечисления денежных средств покупателем от покупки лотов № 1 и № 2 на депозитный счет Управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома.

